№ 2 (67)/2009

# Беларускія Ведамасьці

НЬЮ-ЁРК – ВАРШАВА, красавік-верасень 2009 г.


www.kamunikat.org

*Сьцяг над Вільняй*

# ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ

**25 Жніўня 1991 года** ажыцьцявілася двухсотгадовая мара цэлых пакаленьняў беларускіх змагароў з расейскім заборам. У гэты гістарычны дзень пад напорам дэпутацкай Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце і пры падтрымцы тысячаў людзей на плошчы перад парлямантам была спыненa дзейнасьць КПСС у нашай краіне і канстытуцыйна аб'яўлена незалежнасьць Беларусі. Ад часоў падзелу Рэчы Паспалітай і ліквідацыі Вялікага Княства Літоўскага – нашай магутнай дзяржавы – гэты дзень, **25 Жніўня**, ёсьць рэальна найвялікшай датай нашай двухсотгадовай гісторыі змаганьня за волю і незалежнасьць. Ад гэтага часу незалежная Беларусь рэальна ёсьць, існуе як незалежная дзяржава, знаная ў сьвеце. Ужо дзеля дасягненьня аднаго гэтага варта было жыць. Засталося зрабіць завяршальны крок вялікай беларускай барацьбы – усталяваць у Беларусі беларускую ўладу.

У гэтым сутнасьць змаганьня з антыбеларускім рэжымам. Вораг залез у наш дом. Барацьба ўнутры. Будучыня, жыцьцё і сьмерць нацыі, існаваньне дзяржавы і незалежнасьці залежыць ад зыходу гэтай барацьбы, ад таго, хто вынесе трупы.

Перад кожным пакаленьнем беларусаў, народжаным у ілжы, стаіць выкліканьне – зразумець, што ў змаганьні з імпэрскай Расеяй не было, няма і ня будзе ні кампрамісу, ні паловы, ні міру: альбо яна нас знішчыць, альбо выйдзем на вольны шлях і зробімся незьнішчальнымі.

Гэты шлях пачаўся адразу ў 1794, пасьля рэалізацыі змовы Эўропы (немцаў) з Расеяй – гэта значыць пасьля ліквідацыі ***Вялікага Княства Літоўскага*** і забору Беларусі. Гэты шлях праклаў ***Андрэй Тадэвуш Кась-***

***цюшка***; па ім ішлі 197 гадоў. Ён вымашчаны мільёнамі ахвяр, палеглых за свабоду і волю, але бязь іх не было б 25 Сакавіка 1918-га, а без Сакавіка не настала б 25 Жніўня 1991-га.

Характэрнасьць беларускага гістарычнага змаганьня супраць злачыннай і магутнай імпэрыі за волю і аднаўленьне дзяржавы палягае ў тым, што гэта заўсёды была барацьба авангарду. Таму паражэньні яго мелі страшныя вынікі для нацыі, а перамогі (Сакавік-1918, Жнівень-1991) успрымаліся як цуд, у які многія не маглі паверыць.

Думаючы пра гэты час, які побач, часта хочацца выказаць проста пачуцьці, калі б я не разумеў марнасьць іх для новых людзей, што жывуць у другім вымярэньні. Відаць, найбольш дакладна і найпрасьцей сказаў пра нашыя адчуваньні Пётра Садоўскі, падпісаўшы мне кніжку пра свой „шыбалет": „Зянону на сьветлы ўспамін ад аўтара пра Час, калі мы былі гістарычна шчасьлівыя".

Тады, у пачатку 90-х, будучы ў Вярхоўным Савеце, калі гісторыя тварылася ледзь ні кожны дзень, ніхто з нас, франтаўцаў (абсалютна ніхто), ня думаў пра сучаснасьць як пра гісторыю. Усе гарэлі ідэйнай мэтай і змаганьнем за гэтую мэту. Яна паглынала нас да рэшты. Часта трэба было дасягнуць



(Фота А. Кляшчука)

***2. Вечарам перад Вярхоўным Саветам.***

немагчымага выніку неверагоднымі сродкамі. І мы, будучы ў абсалютнай меншыні ў парляманце, дасягалі яго нават „нагамі" і рукамі сваіх апанентаў, не клапоцячыся пра ацэнкі і меркаваньні. Нам ня трэба было ні вядомасьці, ні папулярнасьці (тады палітыка не была яшчэ пошлым тэатрам), нам патрэбна была перамога, канец камунізму, незалежнасьць і самастойная Беларусь. Гэта мы здабылі, і гэта зрабіла нас „гістарычна шчасьлівымі".

Вопыт 90-х усім нам паказаў, наколькі значным робіцца час у пераломны момант гісторыі, як важна яго прадбачыць, адчуць наперад, імгненна скарыстаць. Беларуская камуністычная намэнклятура падтрымлівала ГКЧП, была заангажаваная ў путч. Калі б ён прадоўжыўся яшчэ дзень-два, усе гэтыя малафеевы *і К* актыўна вымкнуліся б на паверхню (гэбоўская Масква чакала іхняга дэмаршу.) Але яны сьведама прамарудзілі, путч скончыўся, і намэнклятура ў Беларусі ўтрымала ўладу. (Тлумачу. Калі б яны агрэсіўна выявіліся, то пасьля путчу, мы б іх вычысьцілі з улады ўсіх без астатку, скарыстаўшы тую ж ельцынскую Маскву.) Тым часам у дні путчу многія нашы намэнклятурныя дэпутаты-камуністы зрабіліся агрэсіўнымі, не хавалі сваёй радасьці і адкрыта казалі, што нас расстраляюць і ўсім нам „кірдык".

Таму пасьля правалу путчу (22.08.1991) вельмі важна было імгненна сабраць сэсію Вярхоўнага Савета, пакуль у камуністычнай большасьці не мінуў шок, разгубленасьць і жах. Тут прыйшлося вытрымаць баталію і напіраць усімі сіламі, бо многія члены Прэзыдыюма ВС не разумелі, навошта сьпяшацца склікаць Сэсію. Але сэсію ўсё ж прызначылі на 24 жніўня.

22-га жніўня (адразу пасьля паражэньня путчыстаў у Маскве) мы, дэпутаты Апазыцыі БНФ, сабраліся ў Вярхоўным Савеце і працавалі без перадышкі над плянамі, тактыкай дзеяньняў і над заканадаўчымі дакумантамі. Падрыхтавалі 14 заканадаўчых праектаў (гэта, фантастычна, за суткі!).

Мы ўвайшлі ў залю пад Бел-Чырвона-Белым сьцягам. Першым чынам трэба было зьняць з пасады старшыню ВС М. Дземянцея. Я нават не чакаў такога напору ад дэпутатаў-франтаўцаў. Часам у залі стаяў такі рык, што здавалася Дземянцей нават жывым не застанецца. Ён чапляўся за пасаду, як тапелец за травічку, закасваў нават калашыну і паказваў голую лытку, каб усе бачылі, што ён быў ранены ў партызанах. Дземянцея зьнялі.

Быў яшчэ эпізод, калі аднекуль збоку на трыбуну раптам пасунуўся 1-ы сакратар ЦК КПБ Малафееў (ён ня быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.) Тут нашы дэпутаты паўскоквалі зь месцаў і пабеглі на яго. І наперадзе ўсіх Галіна Сямдзянава. Добра, што Малафееў, агаломшаны, не рабіў рэзкіх рухаў, а то (не сумняваюся) напэўна б, разарвалі на часткі. Малафеева прагналі.

Назаўтра была спынена дзейнасьць КПСС і ЛКСМ у Беларусі. Пачаліся дэбаты аб аб'яўленьні незалежнасьці краіны. На плошчы перад парлямантам пэрманэнтна стаяла тысяч 30 людзей і крычалі: „Незалежнасьць! Незалежнасьць!".

(Нагадаю, што Дэкларацыя аб суверэнітэце Беларусі, прынятая 27 ліпеня 1990 года, сама па сабе яшчэ не забясьпечвала незалежнасьці, бо не была канстытуцыйным законам. Усяроўна кіравала Масква. Для дасягненьня незалежнасьці Беларусі патрэбна было надаць Дэклярацыі вагу і значэньне канстытуцыйнага закону.)

На другі дзень сэсіі, і асабліва ў канцы дня, я адчуў, што можам не набраць канстытуцыйную большасьць галасоў. У некаторых камуністаў пачаў малець страх, фармаваліся нейкія стыхійныя пазыцыі, намэнклятура паціху падымала галаву. Усе аргумэнты былі выказаныя, але іх для гэтай масы, што жыла падсьведамасьцю, магло быць замала.

Рашэньне прыйшло да мяне ў апошнюю секунду. Шушкевіч (якому Вярхоўны Савет даручыў весьці Сэсію) ужо стаў рыхтавацца аб'яўляць галасаваньне і (о, жах!) пачаў падыгрываць разгубленым настроям намэнклятуры. Ён публічна выказаў сумненьне, што пры галасаваньні ўдасца сабраць канстытуцыйную большасьць галасоў, разважаў, што пытаньне будзе цяжка вырашыць. Словам, сеяў недавер у намэнклятурных галовах. (Гэта, дарэчы, быў заўсёдны ягоны згодніцкі стыль паводзінаў у тыя часы.) Тут ўзьнікала рэальная небясьпека (асабліва пры „канстытуцыйным" галасаваньні), бо некаторыя дэпутаты (і такіх было нямала) галасавалі так, як меркаваў і ставіў пытаньне вядучы Сэсіі.

Нават зьдзівіцца такім паводзінам Шушкевіча нам ужо не было часу. Я папрасіў апошняе слова і выступіў з засьцярогамі да ельцынскай палітыкі ў Расеі, кажучы, што адтуль нам усім пагроза, што на Ўсходзе фармуецца агрэсіўная імпэрыя ў форме дэмакратыі, што трэба стаць незалежнымі ад гэтай небясьпечнай для нас дэмакратыі і імпэрскай палітыкі. (Цалкам выступ прыведзены ў кнізе С. Навумчыка „Сем гадоў Адраджэньня альбо фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі", – Варшава–Прага, 2006 г., с. 62-63.)

Я ведаў, што намэнклятура баялася, каб іх не дастала ў той сытуацыі рука Ельцына і сваім выступам нагадаў ім пра гэта.

Пасьля выступу ўзьнікла яшчэ дыскусія, якая паказала, што словы мае дайшлі ўсё ж у іхнюю намэнклятурную пяту, дзе сядзела камуна-савецкая іхняя душа. Галасаваньне адбылося трыумфальна: за незалежнасьць прагаласавала 253 дэпутаты з 265 зарэгістраваных у залі. Многія так званыя „дэмакратычныя" дэпутаты, не зразумеўшы майго выступу, яшчэ доўга потым касавурыліся на мяне за крыўду іхняму куміру Ельцыну і „рускай дэмакратыі". Мяне гэта не хвалявала, „дэмакратам" розум ня ўставіш, тым больш, што пазьней і Ельцын, і Пуцін паказалі ўсім сваю імпэрскую „кузькіну маць".

Позна вечарам (ужо сцямнела) закончылася Сэсія Вярхоўнага Савета і мы, дэпутаты Апазыцыі БНФ, выйшлі да людзей на плошчу. Усе радасна ўсклікалі, сьпявалі, сьмяяліся, плакалі ад шчасьця і абымаліся між сабой. Гарэлі агні, палілі газэты замест паходняў. Некаторыя, што не пасьпелі выйсьці з КПСС, тут жа спальвалі свае партбілеты, танцавалі, падскоквалі, як дзеці. Бацькаўшчына незалежная!

Распад імпэрыяў ў Эўропе адбываўся як працэс утварэньня незалежных нацыянальных дзяржаваў. Рухавіком працэсу была паўсюдна нацыянальная ідэя, якая разьвівалася па даволі строгай сістэме і ў рэчышчы агульнай заканамернасьці.



***3. Дэманстрацыя Народнага Фронту ў Горадні. Беларускі Народны Фронт у пачатку 90 – х гадоў – гэта сапраўдны народны рух. У ім удзельнічалі людзі працы, інтэлігенцыя, рабочыя, інжэнеры, служачыя, былыя вайскавікі, дробныя прадпрыймальнікі, работнікі аховы здароўя, вучоныя, мастакі, хатнія гаспадыні – увесь спэктар грамадзтва. Гэта былі людзі, якія стваралі матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасьці, мелі цьвёрды сацыяльны статус, павагу ў грамадзтве і адказнасьць за свае дзеяньні. Сярэдні ўзрост людзей у Народным Фронце адпавядаў ідэальнай палітычнай шкале: 40 гадоў. Гэта яны, гэтыя людзі, сэрцам ўспрынялі Курапаты і падтрымалі барацьбу за незалежнасьць Айчыны. Яны прыўнесьлі сваю энэргію, чалавечнасьць, веру і здаровы дух у змаганьне за ідэалы свабоды. (З. Пазьняк).***

Гістарычныя падзеі апошняга часу ў Беларусі засьведчылі першаснасьць нацыянальнай ідэі, перавагу фэномену незалежнай дзяржавы над сістэмай улады. Нават калі ўлада антынацыянальная, яна ня можа фармальна ліквідаваць дзяржаву, бо ўлада без дзяржавы перастае існаваць.

Дзейнасьць антынацыянальнай улады ў Беларусі накіраваная на вынішчэньне нацыі і культуры па старых каляніяльна-рэпрэсіўных і русіфікацыйных схемах. З гэтага гледзішча антыбеларускі рэжым Лукашэнкі ёсьць крайне разбуральны для беларускай нацыі і ў канцовым сэнсе зьяўляецца пастаяннай пагрозай незалежнасьці нашай краіны.

З усталяваньнем беларускай нацыянальна-дэмакратычнай улады кожны гістарычны крок нашай незалежнасьці будзе адзначаны, а ***Дзень Волі 25 Сакавіка***, ***Дзень Дэклярацыі 27 Ліпеня***, ***Дзень Незалежнасьці 25 Жніўня*** стануць дзяржаўнымі сьвятамі. Кожны дэпутат Апазыцыі Народнага Фронта ў Вярхоўным Савеце БССР будзе ўшанаваны памяцьцю, годнай таго часу, калі ўсе мы былі гістарычна шчасьлівымі.

*22-25 жніўня 2009 г.*

***Зянон ПАЗЬНЯК***

# ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ. ПЕРАМОГА ТЫХ, ХТО БЫЎ З ІДЭЯЙ

**Гэта была найбольшая палітычная перамога ў гісторыі Беларусі двух апошніх стагодздзяў, паўтарыць якую ўжо нікому ня ўдасца – бо, спадзяюся, краіна ўжо ніколі ня страціць Незалежнасьці.**

Тым больш мэтазгодна прааналізаваць, чым быў адметны посьпех 25 жніўня 1991 году, калі Вярхоўны Савет 12-га скліканьня надаў Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце статус канстытуцыйнай сілы.

Адзначу тры найважнейшыя адметнасьці: здольнасьць ***палітычнага авангарду грамадзтва – БНФ –*** выкарыстаць час, мэтанакіраваная праца гэтага авангарду пры супрацьдзеяньні Захаду і нацыянальная ідэя як галоўны матыў масавых выступаў, якія і прывялі да перамогі.

## Без падтрымкі Захаду

Цягам ўсёй савецкай гісторыі, пачынаючы з кастрычніцкага перавароту 1917 года, дэмакратычныя заходнія краіны выступалі супраць камунізму, хаця і ішлі на часовыя альянсы з крамлёўскімі лідэрамі (як у часе Другой Усясьветнай вайны). Аднак ў апошнія дзесяцігоддзі існаваньня СССР Захад (і найперш ЗША) пасьлядоўна падтрымлівалі змагароў з камуністычнай сыстэмай, дамагаліся вызваленьня палітзьняволеных, ставілі эканамічнае супрацоўніцтва з СССР ў залежнасьць ад выкананьня правоў чалавека. Роля Захаду ў дэмантажы камуністычнай сыстэмы вялікая.

Іншая справа – змаганьне народаў СССР за дзяржаўную незалежнасьць. Тут меў месца „падвоены стандарт": адно стаўленьне – да Прыбалтыкі, іншае – да астатніх.

Ідэя Незалежнасьці Беларусі ад моманту, як яна была абвешчана галоўнай палітычнай мэтай БНФ у траўні 1990 году і праз два месяцы прадэкляраваная (хай і не на поўніцу) Вярхоўным Саветам, – не атрымала ніякай палітычнай падтрымкі краінаў Захаду.

Для параўнаньня: Захад ніколі не прызнаваў анэксію Масквой Летувы, Латвіі і Эстоніі, і ў 1989-1990-ых гадох тагачасны прэзыдэнт ЗША Буш (старэйшы) неаднаразова заяўляў прэзыдэнту СССР Гарбачову, што прыбалтыйскія рэспублікі павінны быць незалежнымі ад Масквы. Адпаведныя заявы рабіліся Злучанымі Штатамі і на іншых узроўнях. Лідэры „Саюдзісу", Народных франтоў Латвіі і Эстоніі былі прынятыя ў Белым Доме, у Кангрэсе ЗША, у парлямэнтах краінаў Эўразьвязу.

Нічога і блізка да такой зацікаўленасьці мы ў Беларусі не адчувалі. Да Пазьняка часта прыязжалі заходнія журналісты, пыталіся пра Курапаты і



***4. Вось яны гэтыя людзі Народнага Фронту перад намі на фатаграфіях (фота 4 і 5). На мітынгі БНФ яны хадзілі, як у храм, як на малітву, як на глыток паветра, цэлымі сем'ямі, разам зь дзецьмі і бацькамі. Гэта на іхныя плечы абаперлася нашая незалежнасьць. Угледзьцеся ў іхныя адкрытыя, напоўненыя ўнутраннай прыгажосьцю абліччы, у іхныя вочы, сарамлівыя ўсьмешкі... Гэта наш народ. Гэта мы самыя. Любем жа гэты народ, ён вельмі харошы. (З. Пазьняк).***

звычайна – пра падтрымку ў Беларусі гарбачоўскіх рэформаў. Але як толькі Пазьняк пачынаў казаць пра Незалежнасьць – карэспандэнты складвалі нататнікі і выключалі дыктафоны; іх не цікавілі, як яны лічылі, фантасмагарычныя пражэкты. Ня толькі БНФ, але і Вярхоўны Савет не цікавіў Захад, чыя ўвага сканцэнтравалася выключна на Гарбачове і корпусе народных дэпутатаў СССР.

Больш за тое: Белы Дом заявіў, што будзе ўсяляк падтрымліваць намаганьні Гарбачова па захаваньню СССР (за выняткам Прыбалтыкі).

Дзіўна, але пазыцыя Белага Дому не зьмянілася ні пасьля 27 ліпеня 1990-га, ні пасьля 25 жніўня 1991-га, ні пасьля падпісаньні Віскулёўскіх пагадненьняў у пачатку сьнежня 1991-га. І толькі пасьля заявы Гарбачова пра сваю адстаўку Белы Дом пачакаў яшчэ некалькі дзён і ў перадапошні дзень 1991 году прызнаў незалежнасьць былых рэспублік СССР (але адзначым відавочнае: прызнаўшы, ЗША як ніхто зрабілі шмат для падтрымкі беларускай Незалежнасьці. Эўрапэйскія краіны ішлі за ЗША, звычайна – са спазьненьнем).

Сёньня тая няздольнасьць убачыць відавочнае – непазьбежны распад СССР – лічыцца найвялікшым правалам ЦРУ, тым больш парадаксальным, што Буш у свой час займаў пасаду дырэктара гэтага ведамства і мог бы разьлічваць на максымальна поўную інфармацыю. Няўжо аналітыкі з Лэнглі ня бачылі таго, у чым былі перакананыя франтаўскія актывісты зь Вілейкі ці Лагойску? Няўжо варыянт распаду СССР не разглядаўся і не пралічваўся ў ЦРУ? Бо вядома, што некаторыя амэрыканскія палітолягі прадракалі Саюзу крах. Нарэшце, у ЗША існавала грамада, якая дзесяцігоддзямі наўпрост падтрабавала ад Белага Дому і Кангрэсу прызнаць Беларусь незалежнай краінай – беларуская дыяспара.

Канешне ж, варыянт распаду СССР аналізаваўся, і відавочна, не па адным сцэнары, але Захад быў не зацікаўлены ў ім з адной прычыны. Захад жадаў, каб ядзерная зброя і надалей заставалася пад кантролем адзінага цэнтру, у руках чалавека, зь якім „можна мець справу" – Гарбачова (заўважым, што ўрэшце рэшт ядзерныя боегалоўкі апынуліся пад адзіным кантролем – гэбэшнага Крамля). І дзеля гэтага Захад падтрымліваў Гарбачова (а значыць, і цэласнасьць СССР) усімі магчымымі сродкамі.

Такім чынам, Незалежнасьць была здабытая беларусамі самастойна, без аніякай палітычнай падтрымкі іншых краінаў, і ёсьць тым больш каштоўнай нацыянальнай заваёвай.

## Калі час ня страчаны

У ліпені 90-га Вярхоўны Савет прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным сувэрэнітэце, але адмовіўся ад прапановы Апазыцыі БНФ надаць дэкларацыі статус канстытуцыйнай сілы, што азначала б вяршэнства Канстытуцыі і законаў БССР над „саюзнымі". У выніку Беларусь, як і раней, падпарадкоўвалася Маскве, шмат якія законапраекты, падтрыхтаваныя дэпутатамі БНФ, не прымаліся яшчэ і таму, што супярэчылі „са-



(Фота А. Кляшчука)

*Фота 5.*

юзным” законам. Суседнія Літва і Латвія закладалі асновы дзяржаўнасьці, рэфармавалі эканоміку – Беларусь губляла магчымасьці.

Гэта – прыклад страчанага часу ў палітыцы.

На шчасьце, у вызначальныя дні жніўня 91-га ўдалося скарыстаць іншым чынам і час, і магчымасьці.

Апазыцыя БНФ запатрабавала неадкладнага скліканьня пазачарговай сэсіі ВС – аднак нас пераконвалі, што гэта нерэальна, што ў дэпутатаў-аграрнікаў „адказны час жніва”, што многія дэпутаты ў Крыму і ў Сочы. Мы прапанавалі паслаць за аграрнікамі аўтамабілі, а за курортнікамі – самалёты (у выніку, даехалі і зь вёскак, і з курортаў, без усялякіх спэцрэйсаў). Нам казалі, што сэсія – непадрыхтаваная, а мы за суткі распрацавалі ўсе патрэбныя законапраекты.

Спазьніся мы са скліканьнем сэсіі на некалькі дзён – і Незалежнасьці магло ня быць, бо шок у дэпутатаў-камуністаў ад правалу ГКЧП хутка мінуў. (Могуць запярэчыць: іншыя ж рэспублікі, хто раней, хто пазьней, таксама абвясьцілі Незалежнасьць, няўжо беларусы адзінымі „залежнымі” ад Масквы не засталіся б? Засталіся б! У наступныя гады беларуская наменклятура як ніхто лезла ў абдымкі Масквы, а „першы прэзыдэнт” стварыў з Расеяй хай і фантомную, але „саюзную дзяржаву”).

Але і 25 жніўня настроі значнай часткі дэпутатаў былі не на карысьць Незалежнасьці. Так, супраць выступіў дэпутат А. Лукашэнка, які забаяўся, што „Белоруссия может оказаться в политической и экономической изоляции от России”, і выступіў ня толькі ён. Настрой такіх дэпутатаў адчуў С. Шушкевіч, які вёў сэсію (ён прапанаваў уключыць у павестку дня першым пытаньнем Саюзную дамову), і выказаў сумненьне, што канстытуцыйная большасьць галасоў будзе сабраная. Чым яшчэ больш ускладніў сытуацыю.

І вось тады да мікрафону падыйшоў Пазьняк, які абвінаваціў Ельцына ў шантажы коштамі на нафту, сказаў, што ў Расеі „фармуецца маладая агрэсіўная імпэрыя ў форме дэмакратыі”, і што „сувэрэнітэт дасьць нам магчымасьць стаць свабоднымі і незалежнымі”. „Я прашу вас паставіць гэтае пытаньне і вырашыць яго сёньня. Бо заўтра можа быць позна”, – заклікаў Пазьняк.

Падчас выступу Пазьняка ў Авальнай залі была мёртвая цішыня – такіх слоў ад лідэра апазыцыі не чакалі, бо ў тыя дні Ельцын быў усясьветным сымбалем дэмакратыі, а тут – крытыка і Ельцына, і самой расейскай дэмакратыі.

Калі слова ўзяў сакратар Гомельскага абкаму Міхаіл Мачуленка, я думаў, што пачнецца дыскусія з ужываньнем традыцыйнай для камуністаў „антыфронтаўскай” рыторыкі. І раптам – „я стопроцентно поддерживаю народного депутата Пазьняка и предлагаю здесь же, сейчас же проголосовать за то, что он сказал». Апладысмэнты.

Выступае прэм’ер-міністар Кебіч – у падтрымку.

Былы першы сакратар Ваўкавыскага райкаму Міхаіл Жэбрак: «…если мы сегодня не примем такой закон, то, что предлагает Зенон Станиславович, то надо принять тогда решение о входе Западного края в состав Российской Федерации. Другого выхода нет».

У выніку 253 дэпутаты галасуюць за наданьне Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце статусу канстытуцыйнай сілы (патрэбныя былі 232 галасы).

У 20 гадзінаў 08 хвілінаў 25 жніўня 1991 года Беларусь вяртае Незалежнасьць, і назаўтра газета «Звязда» выходзіць з вялізнай шапкай на ўсю першую паласу : «Беларусь – незалежная!».

## Людзі на плошчы

У жніўні 1991 году БНФ заклікаў людзей выйсьці на плошчу перад Домам ураду, каб падтрымаць дэпутацкую апазыцыю. 19 жніўня, у першы дзень ГКЧП, прыйшло пад 150 чалавек. 20 жніўня – 250. 21 жніўня сабраліся паўтары тысячы, а 24-25 жніўня перад Вярхоўным Саветам стаяла 30 тысяч чалавек.

І калі прызнаць аднаўленьне Незалежнасьці 25 жніўня 1991 года найвялікшым беларускім палітычным здабыткам (а ніяк інакш нараджэньне самастойнай дзяржавы ацэньваць ня выпадае), дык варта памятаць, што вынік дасягнуты людзьмі, якіх паклікала на плошчу іх нацыянальная самасьвядомасьць. І – нішто іншае.

За некалькі месяцаў, у красавіку 91-га, на тую ж плошчу прыйшло ў тры разы болей людзей – менскія заводы абвясьцілі страйк супраць падвышэньня цэнаў. Сто тысяч чалавек былі на плошчы ў Менску, сотні перакрылі чыгунку ў Воршы. Але як толькі Саўмін задаволіў (часткова і часова) эканамічныя патрабаваньні – стотысячны натоўп зьнік. Палітычны вынік стаяньня на плошчы быў нулявы.

Можна прыгадаць і нядаўнія часы: страйкавалі некаторыя менскія заводы, вылучалі сацыяльна-эканамічныя патрабаваньні («Мы ў палітыку не лезем!»), нават накіроўвалі дэлегацыі да будынку адміністрацыі прэзыдэнта. І заўсёды ўлада знаходзіла хуткія і эфэктыўныя спосабы спыніць пратэсты.

Ніколі ў найноўшай гісторыі Беларусі масавыя акцыі, выкліканыя сацыяльна-эканамічнай сытуацыяй, не прыводзілі ні да палітычных, ні да нават істотных эканамічных пераменаў.

І наадварот: калі людзі выходзілі «за ідэю» – мяняўся лёс нацыі, рабілася гісторыя. Так было на Дзяды-88 па дарозе на Курапаты, калі распачалася новая хваля нацыянальнага Адраджэньня. Так было ў верасьні 89-га, калі БНФ вывеў дзесяткі тысяч на Чарнобыльскі шлях і ўлада была вымушаная рассакрэчваць інфармацыю пра катастрофу і выратоўваць людзей. Так адбылося і 24 сакавіка 1996 году, калі трыццаць тысяч менчукоў выйшлі на вуліцы, выказаліся супраць аб'яднаньня Беларусі і Расеі – і Захаду давялося перагледзець сваю пазыцыю («А мы спадзяваліся, што Ельцын гарантуе



*6. 24 жніўня 1991 г. Вярхоўны Савет. Пачатак „Сэсіі Незалежнасьці.” Ля Сьцяга стаяць: Валянцін Голубеў, Зянон Пазьняк, Вольга Галубовіч. Пазьняк выказвае патрабаваньне аб адстаўцы камуністычнага старшыні Вярхоўнага Савета М. Дземянцея.*

www.kamunikat.org

Беларусі дэмакратыю» – цытата з пачутага тады намі з Пазьняком у Сэнаце ЗША).

Перакана" ны: сытуацыю ў Беларусі зьменяць тыя, каго выведзе на плошчу не эканамічны крызіс, а нацыянальная ідэя.

...А тады, у жніўні 1991-га, падтрымка шматтысячнай грамады на плошчы надавала нам сілы і паўплывала на настрой тых, ад каго залежыла прыняцце гістарычнага рашэньня. І таму кожны з гэтых дзесяткаў тысяч мае поўнае права лічыць перамогу сваім уласным здабыткам.

*Сяргей НАВУМЧЫК*

# МАРА ПАКАЛЕНЬНЯЎ І ВЫНІК ЗМАГАНЬНЯ

Дзень 25 жніўня 1991 года быў другім днём нечарговай сэсіі Вярхоўнага Савета, скліканай па ініцыятыве парляманцкай Апазыцыі БНФ пасьля правалу праімпэрскага камуністычнага путчу ў Маскве. У канцы дня, у момант вялікага напружаньня і стамленьня, калі настрой дэпутацкай большасьці быў усё яшчэ няпэўны і ўсё магло павярнуцца не на нашу карысьць, і калі Шушкевіч, які вёў сэсію, прапанаваў „заканчваць нашу работу” – тады, у апошнюю хвіліну, слова ўзяў Пазьняк і, ўдала сыграўшы на паняцьцях і пачуцьцях камуністаў і прадстаўнікоў намэнклятуры, здолеў пераканаць дэпутатаў прагаласаваць за наданьне Дэклярацыі аб дзяржаўным суверэнітэце статусу канстытуцыйнай сілы. ***У 20 гадзін 08 хвілінаў ажыцьцявілася мара пакаленьняў беларусаў – нацыя вярнула Незалежнасьць.*** Гэтыя два дні запатрабавалі ад нас, дэпутатаў Апазыцыі БНФ, каласальнага інтэлектуальнага і псыхалягічнага напружаньня – але вынік, пэўна ж, можна лічыць лепшым і галоўным дасягненьнем жыцьця.*

Пазьней будзе шмат напісана пра „агульныя тэндэнцыі суверэнізацыі рэспублік”, пра „аб’ектыўную адсутнасьць іншага варыянту”, што „усё вырашалася ў Маскве”, нарэшце, што „незалежнасьць на Беларусь звалілася зь неба” – абы толькі прынізіць ролю нацыянальнага авангарду ў здабыцьці рэальнай Незалежнасьці.

„Агульныя тэндэнцыі” распаду СССР якраз ішлі не з Масквы (там Гарбачоў і Ельцын змагаліся за Крэмль, і свабода „нацыянальных ускраінаў” не фігуравала ў ліку іх палітычных прыярытэтаў ) – тэндэнцыі высьпявалі ў тагачасных рэспубліках. Наймацней ў тых, дзе былі актыўнымі нацыянальныя сілы, Народныя франты. Адзначым тут вялізную ролю менскіх „Дзядоў” 30 кастрычніка 1988 года, калі Пазьняку ўдалося прадухіліць, здавалася б, непазьбежнае кровапраліцьце і тым самым ўпершыню ў тагачасным СССР паказаць прыклад мірнай, негвалтоўнай

* У віншаваньні Зянона Пазьняка фронтаўцам такія словы: „25-га жніўня 1991 года праз 200 гадоў акупацыяў і нішчэньняў Беларусь вярнула сваю дзяржаўную незалежнасьць. Слава Беларусі! Віншую ўсіх суайчыньнікаў з 17-й гадавінай найвялікшай нацыянальнай падзеі XX-га стагоддзя! Віншую Беларускі Народны Фронт! Віншую ўсіх сяброў дэпутатаў-фронтаўцаў, наш нешматлікі, сьмелы баявы авангард, што ў тыя трывожныя, унікальныя і рашучыя дні дамогся беларускай перамогі стагоддзяў – зьдзейсьніў цуд над незалежнасьцю. Слава героям, што паклалі жыцьці, йшчэ зь Вялікага Княства стагоддзямі йдучы да гэтага дня! Слава дарагой Бацькаўшчыне! Хай вечна жыве Беларусь!” (www.bielarus.net)

масавай нацыянальнай акцыі ў той час, калі камуністы задумалі і правакавалі вялікую кроў (падзеі ў Тбілісі, Баку, а раней у Алма-Аты, як вядома, разьвіваліся па іншым сцэнары).

Так што Ельцын не „падараваў свабоду" – а вымушаны быў улічваць настроі ў Беларусі, у Прабалтыцы, на Украіне. У яго на памяці быў вопыт Гарбачова, які паспрабаваў кінуць танкі і дэсантнікаў у Вільню і Рыгу. Але ўжо праз некалькі дзён, на пачатку верасьня, Ельцын з маладой „камандай рэфарматараў" пачаў энэргічна адбудоўваць імпэрыю (эканамічна, палітычна і вайскова). Я перакананы, што калі б мы спазьніліся ці каб не былі вынаходлівымі, цьвёрдымі і рашучымі – Беларусь магла б стацца часткай „фэдэрацыі". (Між іншым, Захад – тады – не надта падтрымліваў нашу Незалежнасьць. Захад быў зацікаўлены ў тым, каб ядзерны патэнцыял быў у „адных руках", маскоўскіх.)

Наш посьпех быў бы немагчымым без падтрымкі дзясяткаў тысячаў людзей перад будынкам Дома ўраду, галасы якіх далятаалі ў Авальную залю. Гэта былі нашчадкі паўстанцаў Касьцюшкі і Каліноўскага, чытачоў купалаўскай „Нашай Нівы", заснавальнікаў БНР, слуцкіх ваяроў, тых, хто палег у Курапатах, падпольных антыкамуністычных змагароў – і ніхто з тых людзей, што два дні сьцяною стаялі на плошчы, гукалі, сьпявалі і чые вочы напаўняліся сьлязьмі шчасьця, ніколі ня скажа, што Незалежнасьць на іх аднекуль „звалілася".

***Сяргей Навумчык***
***Народны дэпутат, каардынатар Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце 12 склікання.***

# НЕЗАЛЕЖНАЯ ДЗЯРЖАВА – НАЙВЯЛІКШАЯ КАШТОЎНАСЬЦЬ НАЦЫІ

Мінула 15 гадоў з таго часу, як на першых і апошніх дэмакратычных выбарах Прэзыдэнта Беларусі нечаканую і шумную перамогу атрымаў дырэктар саўгаса „Гарадзец" Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці, дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь XII склікання А.Р. Лукашэнка.

Пакінем па-за ўвагай гэтага артыкула аналіз прычын той ашаламляльнай перамогі выхадца з простага народа, гучнага „змагара з карупцыяй", „заступніка пацярпелых укладчыкаў і ўсіх абяздоленых людзей". Гэта асобная тэма для дасьледваньня духоўнага, культурнага, палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага стану беларускага грамадзтва таго пэрыяду, тэма для ацэнкі шалёнага ўзьдзеяньня антыбеларускіх сіл на свядомасьць духоўна аслабленага, фізічна стомленага, палітычна дэзарыентаванага насельніцтва Беларусі.

Даўно надыйшоў час зрабіць аналіз і падвесьці вынікі дзейнасьці тагачаснага „трыюмфатара." Жыцьцё паказала, што ад моманту інаўгурацыі да сёньняшняга дня А. Лукашэнка пасьлядоўна і мэтанакіравана ўмацоўвае рэжым асабістай улады. Гэта – яго галоўная мэта. Дзеля яе дасягненьня ён разбурыў асновы беларускай нацыянальнай дэмакратычнай дзяржавы як галоўнай перашкоды на шляху дасягненьня сваёй ўласнай мэты.

Вось асноўныя вынікі яго пятнаццацігадовай дзейнасьці.

**1. Ліквідаваны парлямант.** Замест парлямaнта рэжым стварыў дзьве падкантрольныя яму палаты, якія ня маюць нічога агульнага з сапраўдным парлямантам, бо пазбаўлены галоўных прыкметаў і функцыяў парлямaнта.

***Па-першае, „палаты" не зьяўляюцца адзіным заканадаўчым органам краіны***, як гэта ёсць ва ўсім цывілізаваным сьвеце і як гэта было ў далукашэнкаўскай Беларусі. У сёньняшняй Беларусі дэкрэт прэзыдэнта па сваёй юрыдычнай сіле абвешчаны роўным з законам. Гэта дазваляе прэзыдэнту прымаць дэкрэты, якія могуць супярэчыць законам, але яны ня будуць кваліфікаваныя як парушаючыя закон. У такіх умовах „палаты" ня здолеюць забясьпечыць выкананьне прынятага імі закона.

***Па-другое, „палаты" пазбаўлены права кантролю над выкананьнем дзяржаўнага бюджэту, а таксама права кантролю над выкарыстаньнем дзяржаўнай маёмасьці.*** Фармальна „палаты" кожны год прымаюць Закон „Аб бюджэце Рэспублікі Беларусь". Але яны ня маюць права кантраляваць яго выкананьне. У іх нават няма адпаведнага воргана парляманцкага кантролю, як гэта ёсць у парлямантах усіх дэмакратычных краінаў, дзе існуюць ворганы парляманцкага кантролю і як гэта было ў Беларусі падчас дзейнасьці Вярхоўнага Савета XII склікання, калі галоўным органам фінансава-эканамічнага кантролю ў дзяржаве была Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь, падпарадкаваная парляманту. Сёньня ў Беларусі функцыі кантролю над выкананьнем дзяржаўнага бюджэту ўскладзены на Камітэт дзяржаўнага кантролю, які падпарадкаваны прэзыдэнту. Паміж гэтым Камітэтам кантролю і той Кантрольнай палатай Рэспублікі Беларусь ёсьць вельмі істотная розьніца.

Старшыню Кантрольнай палаты большасьцю галасоў прызначала Сэсія Вярхоўнага Савета (калектыўны ворган), і толькі яна (Сэсія) магла вызваліць яго ад пасады. Таму Старшыня Кантрольнай палаты ў сваёй дзейнасьці быў незалежны ад дзяржаўных асоб, кіраваўся толькі Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законам „Аб Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь" і іншымі актамі заканадаўства.

Старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю прызначае і вызваляе ад пасады прэзыдэнт, таму ў сваёй дзейнасьці Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю поўнасцю залежыць ад волі адной асобы. У такіх умовах немагчыма нават уявіць, што Камітэт дзяржаўнага кантролю можа дазволіць сабе арганізаваць праверку эфектыўнасьці выкарыстаньня бюджэтных сродкаў або дзяржаўнай маёмасьці прэзыдэнтам ці яго адміністрацыяй.

Дарэчы, Кантрольная палата Рэспублікі Беларусь уваходзіла ў міжнародны (INTASAE) і эўрапейскі (EURASAE) ворганы парляманцкага кантролю, актыўна і плённа зь імі супрацоўнічала. Але ў 1996 годзе Кантрольная палата была ліквідаваная А. Лукашэнкам адразу, як толькі па даручэнні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь пачала праверку эфектыўнасьці выкарыстаньня дзяржаўных сродкаў і дзяржаўнай маёмасьці ва Ўпраўленьні справамі Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь (ведамстве вядомага І.І. Ціцянкова).

***Па-трэцяе, „палаты" не зьяўляюцца прадстаўнічым ворганам краіны***, паколькі яны не абіраюцца шляхам дэмакратычных выбараў. Гэта засьведчана шматлікімі групамі назіральнікаў, уключаючы эўрапейскіх і міжнародных.

**2. Ліквідавана дэмакратычная выбарчая сістэма.** Падлік галасоў не падкантрольны грамадзтву. Не выпадкова, што вынікі ўсіх лукашэнкаўскіх выбараў не прызнаныя міжнароднай супольнасьцю як дэмакратычныя. **Гэта значыць, што ў Беларусі дзейнічае нелегітымная ўлада з усімі прававымі наступствамі.**

**3. Суды не зьяўляюцца незалежнай галіной улады.** Суддзяў на пасады прызначае прэзыдэнт. Яны залежныя ад яго і поўнасьцю яму падкантрольныя.

**4. Манапалізаваныя сродкі масавай інфармацыі і пераведзены на расейскую мову.** За выключэньнем двух газэт, якія нядаўна выпушчаны на волю, усе астатнія СМІ даносяць да насельніцтва краіны толькі афіцыйную пазыцыю кіруючага рэжыму. На радыё і тэлебачаньні чуваць і бачны толькі адзіны галоўны актор-выканаўца. Усе астатнія – мастацкае афармленне.

**5. Забаронены спрадвечныя нацыянальныя дзяржаўныя сымвалы** – гэрб „Пагоня" і сьвяты Бел-Чырвона-Белы сьцяг, а іх носьбіты жорстка перасьледуюцца. Дзяржаўнымі абвешчаны штучныя сымвалы савецкага часу, якія не адпавядаюць сапраўднай беларускай гісторыі.

**6. З усіх сфэраў жыцця мэтанакіравана выціскаецца беларуская мова.**

Няма ў краіне ніводнага беларускамоўнага дзіцячага садочку, ніводнай цалкам беларускамоўнай школы і ніводнай беларускамоўнай ВНУ.

Ніхто з кіруючых асобаў краіны публічна не ўжывае беларускую мову.

Ніводнае дзяржаўнае прадпрыемства, ніводная дзяржаўная установа не вядуць справаводзтва на беларускай мове, а толькі на мове суседняй дзяржавы.

І гэта адбываецца ў краіне, дзе большасьць насельніцтва – беларусы.

У пачатку 1990-х годоў, да прыходу А. Лукашэнкі, усё было інакш. Актыўна адраджаліся беларуская мова, беларуская школа, беларуская культура, беларуская навука. І вось за 15 гадоў антыбеларускі рэжым усе гэтыя парасткі нацыянальнага адраджэння патаптаў, зруйнаваў. Такога дзікунства няма нідзе ў цывілізаваным сьвеце.

**7. У цяжкім стане знаходзіцца беларуская культура,** фінансаваньне якой знаходзіцца на вельмі нізкім узроўні і далёка не адпавядае яе патрэбам. Але галоўная бяда ў тым, што адукацыя ў галіне культуры – мае не беларускую арыентацыю, не развіваецца беларускі тэатр, амаль не чуваць на эстрадзе, на радыё, на тэлебачанні прыгожых беларускіх песень. Нашу культурную прастору запаланіла танная расейская „папса."

**8. Разбураецца беларуская эканоміка.** Зьніжаецца канкурэнтаздольнасьць найбольш важных відаў прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі. У выніку расьце адмоўнае сальда знешнегандлёвага балансу – аднаго з важнейшых макраэканамічных паказчыкаў. Так за апошнія 14 гадоў яно вырасла больш як у 8 разоў (з 761 млн. дал. ЗША у 1995 годзе да 6 581 млн. дал. ЗША у 2008 годзе) і складае 9,1 % ад агульнага аб'ёму знешняга гандлю краіны. З краінамі СНД адмоўнае сальда за гэты пэрыяд вырасла ў 17,9 раза і ў 2008 годзе дасягнула 11 648 млн. дал. ЗША (28,8 % ад агульнага аб'ёму знешняга гандлю), а з „братэрскай" Расеяй адмоўнае сальда ў 2008 годзе дасягнула 13 648 млн. дал. ЗША (38,1 % ад агульнага аб'ёму зьнешняга гандлю з гэтай краінай).

Унутраны гандаль манапалізуецца праз супермаркеты, якія ствараюцца і кантралююцца не беларусамі. Беларускае ж прадпрымальніцтва пасьлядоўна і мэтанакіравана разбураецца. Пад вылядам навядзеньня парадку ліквідавана большасьць кропак дробнага розьнічнага гандлю, не развіваецца сярэдні бізнэс.

Каб не дапусціць поўнага краху эканомікі і часова прадухіліць сьпеючы ў грамадзтве сацыяльна-эканамічны выбух, рэжым набірае замежныя крэдыты, якія вяртаць павінны будуць нашы дзеці і ўнукі.

Але крэдытадаўцы павінны ведаць, што крэдыты яны выдаюць нелегітымнай уладзе, і выкарыстоўваюцца іх крэдыты не ў інтарэсах народа, а дзеля захавання антыбеларускага рэжыму. Таму іхныя крэдыты зьнікуць разам з рэжымам. Тады спагнаць свае грошы яны змогуць толькі з Лукашэнкі.

**9. Хуткімі тэмпамі расьце вытворчасьць і рэалізацыя насельніцтву гарэлкі і лікёра-гарэлачных вырабаў.** Толькі з 2000 па 2008 г.г. іх вытворчасьць павялічылася з 10,8 млн. дал. да 14, 4 млн. дал. (на 33,3 %). За гэты ж пэрыяд вытворчасьць піва павялічылася з 23,7 млн. дал. да 35,4 млн. дал. (на 49,4 %). ***Беларускія мэдыкі занепакоеныя ростам колькасьці школьнікаў, якія ўжываюць сьпіртныя напоі і піва. Па зьвестках Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадзкага здароўя, у Беларусі 12,1 % вучняў малодшых і 35,4 % вучняў сярэдніх класаў ужо спрабавалі спіртныя напоі. Да 9-11 класа 58,4% школьнікаў ужываюць піва, 52,6 % – віно, 17,6 % – моцныя сьпіртныя напоі. За пэрыяд з 1995 па 2008 гады аб'ёмы продажы гарэлкі і лікёра-гарэлачных вырабаў узрасьлі ў 1,77 раза, піва – у 2,01 раза, а аб'ём ужываньня спіртных напояў на душу насельніцтва за гэты пэрыяд павялічыўся з 6,7 да 11,6 літра чыстага алькаголю.***

***Па дадзеных Сусьветнай аранізацыі аховы здароўя, 8 літраў чыстага алькаголю на душу насельніцтва ёсьць мяжа, за якой пачынаецца дэградацыя нацыі. Такім чынам, кіруючы рэжым ужо перацягнуў беларускую нацыю за гэту небясьпечную мяжу.***

**10. Пагаршаецца сацыяльна-эканамічнае становішча насельніцтва.** У канцы мінулага года была істотна зьніжана заработная плата вялікай колькасьці работнікаў бюджэтнай сфэры – настаўнікам, работнікам культуры, медыцынскім работнікам.

Ужо больш як год не павышаюцца пэнсіі. Пры гэтым цэны на самыя неабходныя тавары і прадукты харчаваньня растуць значна і пастаянна.

**11. Дабіваюць беларускую вёску, некалі жыватворчую крыніцу беларускага народа,** „дзе колісь весела дзяўчаты сьпявалі песьні дружным хорам, з работ ідучы позна борам". Няма ўжо ў ёй вольных сялян. Засталіся толькі гаротныя калгасьнікі ды старыя сумныя пэнсіянеры.

**12. Сьвядома забруджваецца навакольнае асяроддзе.** У чыстай беларускай мясцовасьці ўлада загадвае будаваць АЭС, каб падрыхтаваць беларусам яшчэ адзін Чарнобыль. І гэта робіцца ў той час, калі 46,5 тыс. км$^2$ (больш за 20 % тэрыторыі краіны) застаюцца забруджанымі доўгажывучымі ізатопамі цэзія звыш дапушчальнага ўзроўню, калі забруджана каля 23 % лясоў, 21 % сельскагаспадарчых земляў, 132 радовішчы мінеральных рэсурсаў, калі наступствы чарнобыльскай трагедыі па сёньняшні дзень адмоўна дзейнічаюць на здароўе насельніцтва, навакольнае асяроддзе і эканоміку. Чакаецца, што да 2015 года агульныя эканамічныя страты ад аварыі на ЧАЭС дасягнуць 235 млрд. даляраў ЗША.

Жыццё паказвае, што крыніца гэтых і іншых праблемаў нашага грамадзтва, гэтая „скрыня Пандоры" знаходзіцца ў Маскве.

Гэта там была падрыхтаваная праграма захопу ў 1994 годзе ўлады ў Беларусі праз выбары і праз свайго стаўленьніка Лукашэнку.

Гэта Масква праз Селязнёва, Строева і Чарнамырдзіна (тады верхавіна расейскай ўлады) заблякавала і не дапусьціла ў восень 1996 года імпічмант свайму стаўленьніку і захавала яго ўладу, нягледзячы на тое, што падставаў для імпічманту было больш чым дастаткова.

Гэта ў Маскве распрацоўваюцца і праз падкантрольны ёй кіруючы ў нашай краіне рэжым праводзяцца ўсе антыбеларускія справы, якія разбураюць нашу культуру, нашу эканоміку, заганяюць у нябыт нашу дасканалую, старажытную і прыгожую беларускую мову.

Лукашэнка настолькі глыбока ўлез у інтэграцыю з Расеяй, што ня толькі беларускую палітыку і беларускую эканоміку зрабіў ад яе залежнай, але і свой уласны лёс аддаў у рукі Масквы. Як сцьвярджае расейская газэта „Коммерсант" ад 15 чэрвеня 2009 г., адзін высокапастаўлены супрацоўнік адміністрацыі прэзыдэнта Дзімітрыя Мядзьведзева, камэнтуючы няўдзел А. Лукашэнкі ў маскоўскім саміце калектыўных сіл апэратыўнага рэагавання (КСАР), заявіў: «У нас нет особого расстройства по поводу поведения Беларуси. Видимо, кое-кому просто надоело быть президентом этой страны». Вось так. Растлумачыў проста і зразумела, хто сёння ў нашай хаце гаспадар.

Амаль паўтара стагоддзя таму сапраўдны змагар за беларускі народ, наш нацыянальны герой ***Кастусь Каліноўскі*** сказаў наступныя словы: ***„Як дзень з ночай ня ходзяць разам, так і праўдзівая навука ня ідзе разам зь няволяй маскоўскай… А пакуль яна будзе, нічога ня будзе. Ня будзе праўды, ня будзе дабрабыту, ды ніякай навукі, адно вамі як скацінай варочаць будуць не для дабра, але на пагібель нашую."***

Будучыня нашай Бацькаўшчыны залежыць ад нас, беларусаў, ад нашай працы, ад нашай кемлівасьці, ад нашай актыўнай і цвёрдай беларускай пазыцыі і ад нашага змаганьня. І калі мы ўсе гэта добра ўсьвядомім, то ніякія чужыя сілы ня выратуюць антыбеларускі рэжым. Жыла і будзе жыць вечна наша родная Беларусь.*

***М. К-скі***

# ПАЛІТЫЧНЫ ЧАРНОБЫЛЬ

***(Выступ на курапацкай акцыі Чарнобыльскі шлях – 2009)***

…Ужо мінула 23 гады з таго дня, калі ўзарвалася савецкая атамная станцыя ў Чарнобылі. У 1994 годзе ўзьнік другі Чарнобыль – духоўны і палітычны. Яны ўвесь час скрыжоўваюцца, пашыраючы адзін аднаго і прыносячы вынішчэньне. Сытуацыя, як у чарадзейнай казцы пра каралеўства, у якім усеўся цмок. Чарнобыль наўпрост выкарыстоўваецца цмокам дзеля вынішчэньня народа. Гэта вынік ўнутранай прамаскоўскай акупацыі ўлады ў Беларусі. Уражвае, аднак, ня тое, як маскоўцам удалося гэта зрабіць, уражваюць разбуральныя адкрытыя мэтады нішчэньня пры пасыўным маўчаньні людзей.

---

* Першая публікацыя гэтага артыкула ў „Народнай Волі" таксама была пад псэўданімам (іншым прозьвішчам).

Спачатку ўлада адмяніла ўсялякую дапамогу людзям, што пацярпелі ад Чарнобыля і жывуць на забруджанай радыяцыяй тэрыторыі. Потым ворагі чалавецтва сталі не прапускаць міжнародную гуманітарную дапамогу людзям і бессаромна абкрадваць пацярпелых, спынілі адсяленьне, загадалі сеяць і зьмешваць чыстую прадукцыю з забруджанай для ўнутранага карыстаньня (удакладнім – калектыўнай дозы радыяцыі). Затым прынялі законы аб накіраваньні моладзі на працу ў чарнобыльскія зоны, а нядаўна галоўны ўзурпатар грымеў у Гомельскай вобласьці, што пара засяляць людзьмі спустошаныя радыяцыяй раёны і што з гэтага году ён сваім указам пачаў тое рабіць. „Сейце!" – крычаў хворы, вучоныя ў кабінэтах, маўляў, не разьбіраюцца, а людзі, што жывуць на радыяактыўнай зямлі, лепш ведаюць, дзе можна апрацоўваць глебу, а дзе не.

Ужо каторы год краіна перажывае чарнобыльскія Курапаты, гэта значыць сьведамае зьнішчэньне Чарнобылем. І не чуваць нават прывычнага пытаньня – „За што?"

Такога ніяк ня можна цярпець. Незаконны правіцель абзывае „ворагамі" беларусаў, што не прызнаюць ягонай улады, але ён сам ёсьць тыповым ворагам чалавецтва, які вядзе чарнобыльскую вайну супраць нашага народа. Мы мусім спыніць гэтую вайну. Беларусам за ўсю сваю гісторыю прыходзілася змагацца з усялякай вар'яцкай нечысьцю, пераможам і гэтую.

Мушу зноў паўтарыць: збочаная ўлада і ненармальная дзейнасьць нездаровага начальніка ўлады, якая выклікала разбурэньне культуры, ***стала ў апошні час надзвычай небясьпечнай для беларускага грамадзтва і беларускай дзяржавы.*** Гэтага ўжо даўно нельга цярпець, адбываюцца непапраўныя страты ў эканоміцы, палітыцы і культуры. Паводзіны гэтага чалавека неадэкватныя, скандальныя і амаральныя, яго асабістае жыцьцё збочанае і на віду ва ўсіх выпадае з нармальнасьці, ганьбіць краіну і цэлы народ. Гэты чалавек нясе псіхічны комплекс непаўнавартаснага дзяцінства і дзіцячага астракізму. Ён не засвоіў элемэнтарных асноваў культурных дачыненьняў зь людзьмі і толькі палітычная нясьпеласьць грамадзтва, прыдушанага акупацыйным камунізмам і саветчынай, дазволіла непрыяцелям Беларусі зацягнуць яго на вяршыню ўлады.

Але, хоць і павольна, ужо мінае гэты час цемры і, не сумняваюся, зьнікне дазваньня. Відавочная праўда, што ***нічога, абсалютна нічога, нельга ўжо паправіць, пакуль на верхавіне ўлады знаходзіцца гэты цёмны Лукашэнка, што выпаў з культуры і гістарычнага часу.*** Бываюць анамаліі ў прыродзе, бываюць, на жаль, і ў грамадзтве. Бяда, што нашаму народу прыходзіцца такую анамалію перажываць. Мусім прысьпешваць яе ліквідацыю і назва гэтай бяды – палітычны Чарнобыль. Мы мусім перамагчы вялікую чарнобыльскую вайну і мы пераможам яе. Памятайма і верым, і ўзмацняйма наш вольны народны дух.

***Зянон ПАЗЬНЯК***
***Старшыня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***
*26 красавіка 2009 г.*

# ПЕРАМЕНЫ ТРЭБА РЫХТАВАЦЬ

***(Выступ на красавіцкім Сойме Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ і БНФ „Адраджэньне")***

За мяжой, якая поўніцца ад інфармацыі, стан у Беларусі ўспрымаецца мной як „трывожныя дні". На Беларусі тым часам ранейшы маразм рэжымнага нішчэньня з той хіба розьніцай, што калі ў Менску людзі яшчэ ўпарта церпяць, то ў раёнах і абласьцях беларусу ўжо робіцца нясьцерпна: ні працы, ні заробкаў, ні пэрспэктывы і няма куды дзецца. Магчыма людзі адчуваюць, што самы сабе ўзгадавалі калгасны рэжым і яго начальніка, і няведаюць, што рабіць. Але статыстыка паказвае, што большую падтрымку „галоўны начальнік" мае якраз у абласьцях і раёнах, і што з пачаткам крызісу гэтая падтрымка не зьмалела, а, наадварот, павялічылася.

Прыгледзімся да прычыны гэтай зьявы. Тым больш, што яна існуе пастаянна, яшчэ з часоў пасьляваеннага СССР і нават раней – з 30-х гадоў.

Агульная прычына, як я мяркую, гэта вынік рэпрэсіяў і кіраваньня 200-гадовай расейскай акупацыі. Адбылася дэфармацыя мэнтальнасьці ў пэўнай частцы беларусаў, што выжывалі і прыстасоўваліся пры маскоўскім рэжыме.

Па мэнтальнасьці і па шматлікіх аспэктах жыцьця Расея – гэта ёсьць Азія ў горшым, крымінальным яе выяўленьні, гэта – супольнасьць, пазбаўленая лучнасьці культурных традыцыяў. У гэтым грамадзтве ніколі не было і не сфармавалася супольнага мэханізму абароны асобы ад тыраніі і гвалту ўлады і ад сабе падобных; існуе татальная непавага да закону і абсурднае спадзяваньне на справядлівасьць і волю вярхоўнай асобы як панацэю ад разбою і бяспраўя. У такіх абставінах абсалютнымі каштоўнасьцямі грамадзтва робяцца дзяржава, улада і воля вярхоўнага начальніка. Жыцьцё чалавека перад гэтымі рэальнасьцямі ёсьць другасным, і гэта ўспрымаецца як натуральны парадак рэчаў. Гэта значыць, залежнасьць ад парадку ўлады і чаканьне ад яе справядлівасьці праз пакараньне крыўдзіцеляў. Рухавіком такіх дачыненьняў становіцца нянавісьць, ашуканства, эгалітарнае думаньне. Гэта не эўрапейцы, яны зусім іншыя ў адносінах да сьвету, чым беларусы. У іх іншыя ацэнкі людзей, стандартных дачыненьняў і зьяваў, якія не адразу распазнаюцца з прычыны падобнасьці формы і эўрапейскага выгляду.

Непасрэднай прычынай падтрымкі дыктатуры часткай людзей зьяўляецца сама дыктатура і страх, які яна насаджае. Ад гэтага дэфармуецца калектыўная псіхіка, узьнікае эфэкт закладнікаў, якія ў выпадку небясьпекі (што вядома) пачынаюць супрацоўнічаць з тэрарыстамі. Як правіла, гэта прыкмета псіхалогіі прыстасаванства і зламанага духу. Такія людзі, баючыся невядомасьці і пераменаў, жадаюць не свабоды, а парадку. Яны хапаюцца якраз за дыктатуру і за дыктатара, які гэты парадак, на іх думку, забясьпечыць (ім хочацца Сталіна, Лукашэнкі, расстрэлаў і г.д.).

Цяпер, у час крызісу, мы зьяўляемся якраз сьведкамі праявы такой мэнтальнасьці. Наш тэзіс аб неабходнасьці скарыстаць крызіс дзеля ліквідацыі рэжыму Лукашэнкі як галоўнай прычыны крызісу на Беларусі, ня быў і ня будзе ўспрыняты гэтай катэгорыяй людзей. Ім здаецца (стандартнае апраўданьне), што як абваліцца рэжым і скончыцца рэжымнае рабства, то пачнецца анархія і беззаконьне і стане яшчэ горай. Міфалагічная сьведамасьць малюе страшныя карціны. Характэрна, што (як і трэба было чакаць) найбольш адкрыта гэтую збочаную пазыцыю выказала цяперашняя сэрвільная інтэлігенцыя і ўсе дэмпартыі так званай вікаўскай апазыцыі, якія засьведчылі сваю гатоўнасьць супрацоўнічаць з антыбеларускім рэжымам і разам ратавацца ад крызісу. Дзеяньні „апазыцыйнага" калябаранцтва набываюць панічныя формы.

Наступным важным чыньнікам існаваньня закладніцкай мэнтальнасьці ёсьць узьдзеяньне афіцыёзнай інфармацыі і прапаганды, якая цалкам зманапалізаваная антыбеларускім рэжымам.

Другая частка беларусаў (прыблізна роўная першай катэгорыі людзей) выхад з крызісу зьвязвае зь пераменамі і з пазбаўленьнем ад рэжыму. Сьведама ці ня сьведама ў іх сьпее гатоўнасьць змагацца. Яны ня згодны на антынародны парадак і па сутнасьці не хацелі б чужога парадку, але жадалі б народнай свабоды – грамадзянскай і нацыянальнай.

Мэнтальны і, ў выніку, палітычны падзел добра і пастаянна відаць. Мы мусім улічваць гэтакае становішча ў нашым змаганьні з антыбеларускім рэжымам і правільна разьмяркоўваць ужываньне нашых ініцыятываў.

Мэнтальнасьць свабоды больш актыўная і схільная пашырацца. Такім чынам, ёсьць духоўныя і сацыяльныя падставы дзеля стварэньня арганізаванай пратэстнай сілы, якая можа стацца рашаючым чыньнікам ва ўмовах крызіснага абвастрэньня адносінаў паміж антынародным рэжымам і беларускім грамадзтвам. У гэтым накірунку павінна цяпер працаваць наша народная партыя.

Тут, апісваючы абставіны, мушу зрабіць дэгрэсію, каб падкрэсьліць істотную акалічнасьць. Дзейнасьць антыбеларускага рэжыму і ягонага псіхічна няўстойлівага кіраўніка становіцца ва ўмовах крызісу вельмі небясьпечнай для грамадзтва і беларускай дзяржавы. Ён здольны ў такіх умовах зрабіць учынак, які пацягне цяжкія наступствы для нашай дзяржавы і незалежнасьці. Абсалютная канцэнтрацыя ўлады ў руках аднаго палітычна

і псіхічна ненадзейнага чалавека стварае магчымасьць гэтаму чалавеку выклікаць непапраўнае няшчасьце для цэлай нацыі. І мы бачым, што ён робіць і ведаем, што можа зрабіць.

У час такога разбуральнага дзеяньня і верагоднага крызіснага абвастрэньня першасны выхад заўсёды адзін – зьмена ўлады, адстаўка кіраўніка. Магчымасьць зьмены – гэта ёсьць магчымасьць захаваньня грамадства і дзяржавы перад катастрофай. Але ў тым і справа, што Лукашэнка, як і бальшыня дактатараў, зьнішчыў усе законныя магчымасьці зьмены аўтарытарнага кіраўніка ўлады, пачынаючы ад перапісу і незаконнага ўвядзеньня ў 1996 г. сваёй „канстытуцыі дыктатуры" і заканчваючы стварэньнем машыны выбарчай фальсіфікацыі. Уся нацыя апынулася ў закладніках аднаго неўраўнаважанага і малакультурнага чалавека. Законнага мэханізму яго зьмены практычна не існуе. Беларускі народ загналі ў кут. У выпадку экзыстэнцыяльна-разбуральнага дзеяньня з боку ўзурпатара (здачы сувэрэнітэту Беларусі, напрыклад; увядзеньня чужога войска на нацыянальную тэрыторыю і т.п.) народ мае права на непасрэднае дзеяньне супраць прадажнай улады (арт. 3 Канстытуцыі 1994 г.) і гэта законна.

Тым часам, антынародны рэжым, практычна, імкнецца зачыніць беларусам і гэтую магчымасьць (стварыў велізарнае і мілітарна ўзброенае ўнутранае войска, праводзіць прэвентыўныя рэпрэсіі, падпісаў незаконнае пагадненьне аб карных войсках з Расеяй – „аддзелы хуткага рэагаваньня"). Словам, тут стандарт, тыпалогія дыктатуры; стварэньне незьнішчальнасьці рэжыму паварочваецца парадаксальным бокам, бо правакуе скрайнія дзеяньні (і гісторыя гэта пацьвярджае). Той, хто заганяе ў кут цэлы народ, адначасна заганяе ў кут самога сябе.

Пра мірную схему зьмены ўлады ў Беларусі з удзелам грамадзтва я ўжо пісаў раней у агульных рысах. У гэтай сувязі ёсьць яшчэ адна, нібыта пабочная тэма, якую ніхто не абмяркоўвае, але якая датычыць дзяржавы і кожнага беларуса. Гэта пытаньне грошай, нарабаваных узурпатарам шляхам эксплуатацыі беларускай дзяржавы. Сістэма эксплуатацыі і мэтады рабаваньня беларусаў бачныя ўсім, хто ўмее глядзець. З самага пачатку быў створаны паралельны бюджэт (што само па сабе крымінал), якім па сёньняшні дзень распараджаецца выключна адзін Лукашэнка і ніхто ня бачыў, колькі там грошай, адкуль прыходзяць і куды выходзяць, і, увогуле, дзе яны знаходзяцца. У канцы 90-х гаварылі і друкавалі, што ў гэтым „бюджэце" 11 мільярдаў даляраў. У 1998 годзе за паўгода перад бамбаваньнем Сэрбіі амэрыканскай авіяцыяй (1999 г.) Лукашэнка паехаў раптам без патрэбы ў Бялград, абымаўся там з Мілошавічам, гаварыў траскучыя палітычныя „бздуры", накшталт аб'яднаньня Сэрбіі, Беларусі і Расеі ў „саюзную дзяржаву" і потым ад'ехаў.

Тады і ў Амэрыцы, і ў Эўропе ў палітычных колах я чуў адну і тую ж гісторыю (прытым з падрабязнасьцямі). Грошы Лукашэнкі былі ў сэрбскім банку. Зразумеўшы, што „друг Слабадан" можа дрэнна скончыць, Лукашэнка прыехаў да яго абымацца і клясьціся ў дружбе. У выніку Слабадан Мілошавіч асабістым уплывам выдзеліў яму бранявік для перавозкі грошай з банку на самалёт. Вазілі тры дні. Перавозкай кіравалі чальцы сям'і „вялікага сябра Сэрбіі". Самалёт адляцеў у невядомым кірунку. Потым стала вядома, што прызямліўся ён у Лівіі. Усё было спакойна, пакуль не пачаўся фінансавы крызіс. Узурпатар захваляваўся і запрасіў „брата Муамара" ў Менск. „Брат" прыехаў са сьвітай, бедуінскім шатром і дзяўчаткамі-"ахоўніцамі" (Кадафі – арыгінал), пабыў і паехаў (прынялі для віду нейкі мэмарандум аб нейкіх неіснуючых „дачыненьнях").

Выснова з гэтай брацкай дружбы можа быць толькі адна: грошы, забраныя ў беларускага народа, павінны быць вернуты беларускаму народу. Зразумела, дзе яны знаходзяцца. Хай ляжаць. Муамару Кадафі беларусы толькі падзякуюць.

Вяртаючыся да крызісу, не паляную паўтарыць: народным сілам трэба рыхтаваць сваю тэхнічную сістэму выбарчага працэсу. Зрабіць гэта ўвогуле не складана, яна можа вельмі прыдасца. Прэзыдэнцкія выбары, у выпадку перамены, трэба правесьці разам з парляманцкімі па законнай Канстытуцыі 1994 года.

Аб эўрапалітыцы. Да жніўня 2008 г. Эўразьвяз ня меў выразнай стратэгіі ў дачыненьні да Беларусі. Існаваў падвойны стандарт: штурханьне Беларусі ў Расею (немцы) і, адначасна, адпрацаваныя штампы падтрымкі „барацьбы за дэмакратыю" са стварэньнем сваёй крэатурнай „апазыцыі" і ўпорам на „правы чалавека".

Цяпер, пасьля расейскай агрэсіі супраць Грузіі зьявілася стратэгія, заснаваная на геапалітыцы, так званае „Усходняе партнёрства" (мадыфікацыя нашай фронтаўскай канцэпцыі БЧС – Балтыйска-Чарнаморскай Супольнасьці). Недахоп гэтай стратэгіі ў тым, што яна канцэптуальна не распрацавана. Эўразьвяз, адкінуўшы тупіковыя гульні са сваёй падстаўной „апазыцыяй", напрасткі стаў супрацоўнічаць з антыбеларускім рэжымам Лукашэнкі, практычна (як і раней), выкінуўшы з гэтай сваёй стратэгіі нацыянальныя інтарэсы Беларусі.

„Усходняе партнёрства" мы, вядома, падтрымліваем. Але генэральныя дачыненьні Эўразьвязу мусяць быць ня толькі з антынародным рэжымам, але і зь беларускім народам і зь яго палітычнымі арганізацыямі (прытым з усімі, а ня толькі зь эўрапейскай „апазыцыйнай" падстаўкай). У адваротным выпадку станоўчага сэнсу ў гэтым ня будзе. Апартуністычная эўрапалітыка дачыненьняў толькі з рэжымам умацуе гэты акупацыйны рэжым, узаконіць рэпрэсіі і этнацыд беларусаў і легітымізуе вынікі фальшывых выбараў, што аблегчыць агрэсію Масквы, палітычную і эканамічную інвазію ў нашу краіну.

Цяпер асобным пытаньнем для Эўропы і Беларусі паўстала праблема: запрашаць ці не запрашаць Лукашэнку ў Прагу на саміт Эўразьвязу. Складваецца ўражаньне, што перамагае апартунізм. Хаця зразумела ўсім зацікаўленым бакам, што запрашаць узурпатара нельга. Гэтае запрашэньне нікому не патрэбнае. Яно не патрэбна нам, беларусам, па вялікаму кошту (а не па нямецкаму) яно не патрэбнае Эўразьвязу, Расеі і самому Лукашэнку. (Незапрашэньне аблегчвае яго дачыненьні з Мядзьведзевым-Пуціным і дае козыры ў перамовах з Эўразьвязам.) Такім чынам, запрашаць Лукашэнку на інаўгурацыйны саміт „Усходняга партнёрства" ў Прагу ня трэба. Інакш гэта легалізуе бяспраўе і этнацыд, ўмацуе рэпрэсіі рэжыму і ціск на народ Беларусі. Такая наша пазыцыя.

Беларусам цяпер вельмі важна ўмацаваць сваю нацыянальна-дэмакратычную палітычную сілу, адрадзіць яе масавасьць і ўплыў на палітыку. Інакш Эўразьвяз ня будзе лічыцца з інтарэсамі Беларусі. Мы не павінны стаць пешкамі ў чужой палітыцы, асабліва ў такім збочаным варыянце як супрацоўніцтва Эўразьвязу з антыбеларускім рэжымам. Усё гэта без нашай сілы і нашай палітыкі можа абярнуцца супроць Беларусі, прывесьці да чарговага падзелу нашай уласнасьці і эканомікі паміж Масквой і Эўразьвязам.

Бессэнсоўна, аднак, доўга разважаць пра магчымасьці чужой палітыкі. Наш лёс і наша будучыня вырашаецца ў Беларусі. Але сутнасьць гэтага вырашэньня заключаецца ў арганізацыі змаганьня і ў барацьбе з антыбеларускім рэжымам з мэтай яго ліквідацыі і ўсталяваньня нармальнай беларускай і дэмакратычнай улады. Тым часам падстаўная апазыцыя цяпер, калі Эўропа яе пракінула, таксама залемантавала, што ўсё вырашаецца на Беларусі. Але сутнасьць іхняга вырашэньня (Лябедзька), гэта не барацьба, а супрацоўніцтва з антыбеларускім рэжымам, пра што яны пастаянна цяпер кажуць. Як бачым, усё ў іх вяртаецца на свае кругі. Наш шлях – барацьба. Свабоду мы можам мець, толькі здабыўшы яе ў змаганьні.


***Зянон Пазьняк***

***Старшыня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***


*11 красавіка 2009 г.*

# ЗВАРОТ ДА ЭЎРАЗЬВЯЗУ І ЭЎРАПЕЙСКІХ ПАЛІТЫКАЎ

Мы вітаем добрую волю Эўразьвязу, накіраваную на падтрымку дэмакратычных сілаў Беларусі. Разам з тым, у сувязі з інаўгурацыйным самітам праграмы „Усходняе партнэрства", які пляную правесьці Эўразьвяз у Празе 7-га траўня гэтага году, мы мусім заявіць, што пэўная канцэптуальная неакрэсьленасьць гэтай добрай і ўзаемавыгаднай праграмы ў дачыненьні да дзяржаўнай палітыкі ў Беларусі прывядзе да вельмі нэгатыўных вынікаў.

Запрашэньне кіраўніка ўлады А. Лукашэнкі на саміт у Прагу ёсьць знакавым дзеяньнем, якое, фактычна, легітымізуе дыктатуру, скасуе незаконнасьць яе ўлады і прынятых антыпраўных рашэньняў. Вынікам запрашэньня А. Лукашэнкі ў Прагу стане ўзмацненьне рэпрэсіяў і этнацыду беларусаў, ціску на народ, перасьледу па палітычных прычынах за іншадумства.

Мы ведаем становішча ў нашым грамадзтве, узровень думаньня і матывы паводзінаў А. Лукашэнкі. Нягледзячы на міжусобныя супярэчнасьці зь некаторымі сваімі саюзьнікамі, рэжым Лукашэнкі праводзіць зь імі ўзгодненую палітыку, у тым ліку і ў падыходзе да „Усходняга партнэрства". Нявызначанасьць палітычных крытэрыяў з боку Эўразьвязу задавальняе антыбеларускі рэжым А. Лукашэнкі і яго саюзьнікаў, але супярэчыць інтарэсам Беларусі.

Аморфнасьць крытэрыяў у дачыненьні да антыбеларускага рэжыму Лукашэнкі ставіць пад пагрозу нацыянальнае, гуманістычнае і дэмакратычнае разьвіцьцё беларускага грамадзтва.



(Фота: А. Матолка)

*7. Прага, 7 траўня 2009 г. Ранішняя прэс-канфэрэнцыя перад пачаткам Саміту аб Усходнім Партнёрстве.*

Пасьля новых арыштаў у Беларусі па палітычных прычынах, пасьля дэманстратыўных зрываў візыту эўракамісара па зьнешніх сувязях і палітыкі добрасуседзтва, ёсьць дастаткова аргумэнтаў, каб не запрашаць Лукашэнку на саміт.

У нас, падпісантаў гэтага звароту, розныя партыйныя пазыцыі і розныя погляды на палітыку, але пагроза Незалежнасьці нашай краіны і нашай грамадзянскай супольнасьці, якая ўзьнікае ў сувязі з аднабокімі дзеяньнямі ў дачыненьні да рэжыму на Беларусі, змушаюць нас гаварыць цяпер разам і адным голасам: Лукашэнка не павінен быць запрошаны ў Прагу.

Мы спадзяемся на падтрымку гэтага звароту з боку нашых балтыйскіх і заходніх суседзяў і прыхільнікаў адказнай палітыкі.

***Івонка Сурвіла,***
***Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі,***
***Зянон Пазьняк,***
***кандыдат на прэзыдэнта Беларусі ў выбарах 1994 г.***
***Станіслаў Шушкевіч,***
***кандыдат на прэзыдэнта Беларусі ў выбарах 1994 г.***
***Аляксандар Казулін,***
***кандыдат на прэзыдэнта Беларусі ў выбарах 2006 г.***

*16 красавіка 2009 г.*
*Варшава, Менск, Атава.*

# АБ УСХОДНІМ ПРАРТНЁРСТВЕ

***(Заява)***

Мы вітаем ідэю „Усходняга партнёрства" і выказваем прызнаньне Эўразьвязу за ўключэньне ў гэтую праграму Рэспублікі Беларусь.

Мы разумеем важнасьць агульных задачаў, якімі кіруецца Эўразьвяз, прапануючы новы падыход у дачыненьні да антыдэмакратычнага рэжыму Лукашэнкі, які мэтанакіравана зьнішчае грамадзянскую супольнасьць у Беларусі.

Мы лічым, аднак, што забесьпячэньне правоў грамадзянскай супольнасьці і кожнага чалавека павінна стаць ўмовай дачыненьняў з аўтарытарнай уладай Аляксандра Лукашэнкі і мусіць быць адзначаная ў пратакольнай частцы партнёрства. Удзел грамадзянскай супольнасьці ва „Усходнім партнёрстве" стане гарантыяй пазытыўных крокаў, будзе ствараць магчымасьці станоўчага выбару для існуючай улады. Бяз гэтага ўдзелу Партнёрства не асягне станоўчых вынікаў і будзе скарыстана антыдэмакратычным рэжымам для апраўданьня сваёй разбуральнай дзейнасьці.

Мы засяроджваем увагу на антыкультурным характары рэжыму Лукашэнкі. Побач з разбурэньнем грамадзкай дзейнасьці і зламаньнем правоў чалавека гэты рэжым метадычна зьнішчае беларускую культуру, адукацыю і творчасьць, нацыянальную гістарычную навуку, а грубую русіфікацыю зрабіў галоўнай асновай сваёй антыкультурнай палітыкі. Культура ў сучасным сьвеце становіцца адным з галоўных чыньнікаў сувэрэнітэту. Гвалтоўная русіфікацыя і зьнішчэньне культуры павялічвае адмоўны ўплыў праімпэрскіх колаў расейскай палітыкі на Беларусі.

У прыярытэтных накірунках дзейнасьці „Усходняга партнёрства" мы хацелі б бачыць дапамогу па зьберажэньні беларускай культуры ад сістэматычнага вынішчэньня антыбеларускім рэжымам. Мы прапануем да тых пяці пазыцыяў, вылучаных з 12-ці патрабаваньняў Эўразьвязу да ўлады ў Беларусі, дадаць шосты пункт ***аб забесьпячэньні свабоднага разьвіцьця беларускай культуры, адукацыі і творчасьці.***

Мы лічым, што прыярытэтнымі накірункамі супрацоўніцтва ў галіне эканомікі маглі б стаць энэргетыка і дыверсіфікацыя паставак энэргетычных рэсурсаў, менавіта – інвестыцыі ў праектную і тэхналягічную дзейнасьць па транспартыроўцы энэргетычных рэсурсаў (нафты, газу, электрычнасьці).

Лічым неабходным таксама скасаваньне ўсіх перашкодаў з боку ўлады ў галіне доступу насельніцтва да інфармацыі і культурна-асьветніцкіх праектаў. Спрашчэньне візавага рэжыму і зьмяншэньне коштаў за візы для грамадзянаў Беларусі спрыяла б узаемаабмену думак і разуменьню дэмакратычнага ладу жыцьця.

Мы хацелі б прыцягнуць увагу палітыкаў Эўразьвязу да сігналаў аб выпрацоўцы сумеснай стратэгіі Лукашэнкам і яго ўсходнімі саюзьнікамі ў дачыненьні да „Усходняга партнёрства." На наш погляд, калі недаацаніць гэты чыньнік супрацiўленьня і не падключыць да праграмы „Усходняга партнёрства" ўсіх сілаў Рэспублікі Беларусь (уключна з эміграцыяй), то пэрспэктывы Партнёрства ў Беларусі могуць не разьвіцца, або спыніцца (што найгорш) на ўзроўні фактычнага прызнаньня і легітымізацыі недэмакратычнага рэжыму.

Адчуваючы адказнасьць за наш народ, мы зацікаўленыя ў жыцьцяздольнасьці партнёрскай праграмы. Мы спадзяемся, што наша пазыцыя будзе пачута і падтрымана ініцыятарамі і ўсімі ўдзельнікамі „Усходняга партнёрства."

***Івонка Сурвіла,***
***Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі,***
***Зянон Пазьняк,***
***кандыдат на прэзыдэнта Беларусі ў выбарах 1994 г.***
***Станіслаў Шушкевіч,***
***кандыдат на прэзыдэнта Беларусі ў выбарах 1994 г.***
***Аляксандар Казулін,***
***кандыдат на прэзыдэнта Беларусі ў выбарах 2006 г.***

*6 траўня 2009 г. Прага.*

# ПАРТНЁРСТВА І ІНТАРЭСЫ

***(Ліст да сяброў Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ і Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”)***

...7-га траўня ў Празе на саміце Эўразьвязу была прынятая і зацьверджаная праграма „Усходняе партнёрства.” Гэта падзея, якая патрабуе грунтоўнага асэнсаваньня. Перад самітам нам, беларусам, неабходна было ўмяшацца ў сытуацыю, каб паправіць тое, што можна паправіць. Бо, здаецца, ня ўсе ўсьведамляюць, наколькі небясьпечны паварот адбываецца ў эўрапейскай палітыцы.

Галоўная задача, якая стаяла перад намі (беларусамі з Бацькаўшчыны і замежжа) і, як вядома, перад шэрагам эўрапейскіх палітыкаў, – не дапусьціць Лукашэнку ў Прагу. Задача дасягнута. Другая задача – увесьці ў кантэкст палітыкі Эўразьвязу патрабаваньне аб абароне беларускай культуры, адукацыі і творчасьці ад вынішчэньня антыбеларускім рэжымам. Гэтая задача пастаўлена і адчыненыя магчымасьці яе ажыцьцяўленьня.

„Усходняе партнёрства” дае беларусам магчымасьць манеўру ў выпадку абвастрэньня палітычнага і эканамічнага націску з боку Расеі. Праграма прадугледжвае верагоднасьць уцягваньня беларускага грамадзтва ў сфэру эўрапейскіх дачыненьняў.

Аднак „Усходняе партнёрства” запраграмаванае на супрацоўніцтва Эўразьвязу з антыбеларускім рэжымам. Калі пачнуцца інвэстыцыі з Эўропы і сумесныя энэргетычныя праекты, усялякія размовы пра дэмакратыю і правы чалавека скончацца (яны ўжо, фактычна, скончыліся). Самая вялікая небясьпека для нас у тым, што рэжым атрымае карт-блянш на поўнае вынішчэньне беларускай культуры і легітымізацыю сваёй улады з рук Эўропы. У гэтым зацікаўлены рэжым і Расея (каб увесьці незаконныя пагадненьні з нелегітымным Лукашэнкам у прававое поле). Калі такое адбудзецца, тады пачнецца працэс падзелу беларускай эканомікі паміж Аб'яднанай Эўропай і Фэдэратыўнай Расеяй (дакладней, паміж эўрапейскім капіталам і расейскай эканамічнай мафіяй).

У такой сытуацыі цяперашнюю вікаўскую апазыцыю чакае поўная маргіналізацыя і адкідваньне на ўзбочыну палітычных працэсаў.

Новая апазыцыя, якая магла б змагацца з рэжымам як сіла, павінна будзе ў новых ўмовах стратэгічна, тактычна і канцэптуальна зьвярнуцца да нацыянальнай ідэі і зыходзіць з нацыянальных інтарэсаў. (На нашу народную Партыю – КХП-БНФ – кладзецца вялікая адказнасьць). Калі такая шырокая нацыянальная апазыцыя ня ўзьнікне, то ня ўзьнікне ніякай.

Апазыцыйныя варожаму рэжыму нацыянальныя сілы павінны мець поўнае праграмнае забесьпячэньне па эканоміцы, сацыяльнай, фінансавай, прававой, абароннай, экалягічнай сфэрах, але аб'ядноўвацца мусілі б на клопатах па абароне дзяржаўнай незалежнасьці, у імкненьні да свабоды і ў барацьбе за захаваньне беларускай культуры як важнейшага чыньніка суверэнітэту і грунту дэмакратычных пераўтварэньняў. Беларуская культура ёсьць ідэалягічная альтэрнатыва антыбеларускаму рэжыму і імпэрскай палітыцы Расеі.

Мэтай барацьбы новай беларускай апазыцыі павінен стаць катэгарычны імпэратыў: ***Лукашэнка нелегітымны кіраўнік і павінен пакінуць уладу.***

Мусіць быць распрацаваная і ўжытая новая тактыка, заснаваная на сумяшчэньні легальнай і нелегальнай дзейнасьці (стыхійна яна ўжо існуе).

Усе гэтыя пытаньні трэба вырашаць, улічваючы эканамічны і сістэмны крызіс грамадзтва і асаблівую мэнтальнасьць людзей.

Прыклад беларускага ўзаемадзеяньня ў Празе перад падрыхтоўкай да саміту паказаў прынцыповую магчымасьць мэтавага злучэньня антырэжымных сілаў на падставе агульнанацыянальных інтарэсаў. Тым часам пражскія назіраньні, слуханьні і наступны за гэтым аналіз выказваньняў і падзеяў прыводзяць мяне да высновы, што праект „Усходняга партнёрства” ўспрыняты рэжымам сур'ёзна (прынамсі на бліжэйшую пэрспэктыву), і спадар Мілінкевіч сьведама выконвае ролю лабі гэтага рэжыму ў Эўропе. Каардынацыя яго паводзінаў з палітыкай рэжыму Лукашэнкі ў праграме „Усходняе партнёрства” не выклікае цяпер сумніву. Мяркую, што да гэтага трэбааднесьціся ўважліва, бо лабі, супраца і калябарацыя сярод знаных асобаў будуць павялічвацца.

Трэба разумець прагматычную схему заходнеэўрапейскай палітыкі, якая будуецца на энергетычнай і абароннай бясьпецы ад пагрозы з Усходу. У канцы 90-х і пачатку 2000-х стаўка была зроблена на зьнішчэньне беларускай нацыянальна-дэмакратычнай апазыцыі (Народнага Фронту) і стварэньне сваёй, залежнай ад Захаду, кіруемай апазыцыі на грунце касмапалітычнай дэмакратыі і тэзісах аб правах чалавека. Пытаньні аб нацыянальнай культуры і нацыянальным разьвіцьці, аб гарантыях незалежнасьці тут прынцыпова не ўзгадваліся. Такую „апазыцыю” ім удалося стварыць, раскалоўшы Народны Фронт і злучыўшы нешматлікія „дэмакратычныя” партыі. На дзейнасьць дэмапазыцыі выдаткавалі велізарныя сродкі (што яе й загубіла – грошы, халява плюс безідэйнасьць).



***8. Брусэль, 2009 г. Новая эўрапалітыка. Бэніта Вальднэр з паклонам, гатовасьцю і падлыжнай ўсьмешкай трасе руку міністра замежных справаў антыбеларускага рэжыму Сяргея Мартынава.***

Укараняючы сваю апазыцыйную схему ў Беларусі, Захад ня гідзіўся таемным супрацоўніцтвам з рэжымам і КГБ (Ганс Вік). Меліся два варыянты разьвіцьця схемы: прывядзеньне да ўлады кіруемай апазыцыі праз электаральныя выбары (сэрбскі варыянт) і ўключэньне Беларусі ў склад Расеі, якую заходнія „чэмбэрлены” называлі „дэмакратычнай” краінай. Расейскі аншлюс, на іх „думку”, паспрыяў бы беларускай дэмакратыі.

Праз восем гадоў апазыцыйнага маразму, які Захад нагарадзіў у Беларусі, праваліліся ягоная схема і варыянты. Прытым „чэмбэрлены” так і не зразумелі, чаму электаральная схема спрацавала ў Сэрбіі і не ўдалася на Беларусі. Хаця адказ элемэнтарны і ляжыць на паверхні. ***Дэнацыяналізаванае грамадзтва ня ў стане змагацца за свабоду.*** І Захад (разам са сваёй „апазыцыяй”) спрыяў гэтай дэнацыяналізацыі, прынамсі сваім маўчаньнем, калі душылі беларускую мову, зачынялі беларускія школы, палілі беларускія падручнікі, разбуралі беларускія выдавецтвы і кнігадрук, душылі творчыя саюзы, зьдзекваліся над вялікімі беларусамі.

Шыльдбюргерскую памылковасьць другога варыянту заходняй палітыкі ўбачылі толькі ў 2008 годзе пасьля расейскіх газавых войнаў і ваеннай агрэсіі супраць Грузіі. Тое, што ў Расеі ўсталяваўся гэбізм і што рускі антычалавечы рэжым такі ж антынародны і антыдэмакратычны, як і рэжым у Беларусі, яны зразумелі, аказваецца, толькі цяпер. Вынікам гэтага зразуменьня стала „Усходняе партнёрства”.

З самага пачатку пранікненьня (1998 г.) заходняй прагматычнай палітыкі ў беларускую антырэжымную барацьбу, мы, фронтаўцы, як і ў выпадку з расейскай „імпэрскай” палітыкай, паказвалі ўсю падступнасьць і небясьпечнасьць яе для Беларусі, выкрываючы яе тактыку і стратэгію, наклікаючы на сябе нянавісьць ды ўлюлюканьне палітычных прафанаў. Цяпер, сутыкнуўшыся з брусэльскім „рэалізмам” наўпрост, яны, як аглушаныя, хапаюць паветра.

Тым часам людзі, якія ўсе гэтыя гады мелі доступ да нашай фронтаўскай інфармацыі і нашай дзейнасьці, ёсьць добра інфарматыўна падрыхтаваныя да таго, што рэальна адбываецца, валодаюць ідэалёгіяй і тэрміналёгіяй сапраўднага дэмакратычнага беларускага змаганьня.

www.kamunikat.org

Наша фронтаўская арыентацыя на ўнутраныя палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя праблемы, на нацыянальнае асьветніцтва і культуру, на Беларусь застаецца нязьменнай. Але ўвага да эўрапалітыкі мусіць цяпер павялічыцца і набыць канкрэтныя кшталты (аналіз, факты, прапановы і нават праекты). Мы мусім ня толькі сьведчыць, але і рабіць, прапаноўваць дзеяньні для рэалізацыі. Мы (зрэшты, усе арганізаваныя і актыўныя беларусы) павінны будзем змушаць заходніх „партнёраў" да дзеяньняў з намі (і ў нашых інтарэсах) ў той час, калі яны вымушаны супрацоўнічаць з рэжымам. Нашымі саюзьнікамі будуць краіны Скандынавіі і ўсе дзяржавы былой савецкай зоны, дзе шануюць культурную ідэнтычнасьць і добра ведаюць, што такое расейскі імпэрыялізм і якім розумам трэба „понять" Расею.

Новая беларуская апазыцыя вымагае патрыятызму, апоры на нацыянальныя каштоўнасьці і на Беларусі народ. Гэты час будзе цяжэйшым, але можа стаць паваротным. Упэўнена, бяз горычы й страху, спатыкайма яго.

*Зянон Пазьняк*
*Старшыня Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"*
*і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ*
*10 траўня 2009 г.*

# ПАРУШЭНЬНІ Ў ЧАСЕ РЭФЭРЭНДУМУ – 1995

14 траўня 1995 года адбыўся рэфэрэндум па чатырох пытаньнях, прапанаваных А. Лукашэнкам. Наколькі ён быў легітымны? Паводле меркаваньняў шэрагу юрыстаў, як працэдура прызначэньня, гэтак і само правядзеньне рэфэрэндуму дазваляюць казаць пра парушэньні тагачасных Канстытуцыі і законаў.

### Сумнеўная легітымнасьць пытаньняў

У сакавіку 1995 года прэзыдэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандар Лукашэнка прапанаваў Вярхоўнаму Савету прызначыць рэфэрэндум па наступных пытаньнях:

***«Ці згодны Вы з наданьнем рускай мове аднолькавага статусу зь беларускай?»***

***«Ці падтрымліваеце Вы прапанову аб устанаўленьні новых Дзяржаўнага сьцяга і Дзяржаўнага гэрба Рэспублікі Беларусь?»***

***«Ці падтрымліваеце Вы дзеяньні прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, сьціраваныя на эканамічную інтэграцыю з Расейскай Фэдэрацыяй?»***

***«Ці згодны Вы з неабходнасьцю ўнясеньня зьмяненьняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якія прадугледжваюць магчымасьць датэрміновага спыненьня паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусь у выпадках сістэматычнага ці грубага парушэньня Канстытуцыі?»***

Паводле артыкулу 78 тагачаснай Канстытуцыі, рэфэрэндум павінен быў праводзіцца ў адпаведнасьці з законам. Прававыя аспэкты рэфэрэндуму рэгуляваліся Законам „Аб усенародным галасаваньні (рэфэрэндуме)". Паводле яго, на рэфэрэндум не маглі выносіцца пытаньні нацыянальна-гістарычнай адметнасьці (калі патлумачыць простымі словамі – мова, гістарычныя і нацыянальны каштоўнасьці не належаць сучаснаму пакаленьню, і яно не мае права пазбаўляць іх пакаленьні будучыя, і наогул вырашаць і за продкаў, і за нашчадкаў). Менавіта такімі пытаньнямі зьяўляліся два пытаньні з чатырох, прапанаваных А. Лукашэнкам: аб статусе беларускай мовы і аб дзяржаўных сымвалах. Варта нагадаць, што якраз на гэтай падставе за некалькі месяцаў да рэфэрэндуму Цэнтральная камісія па выбарах і рэфэрэндумах адмовіла групе грамадзянаў у правядзеньні рэфэрэндуму па моўным пытаньні, і пяць парляманцкіх камісіяў далі адмоўныя заключэньні, бо прапанова не адпавядала заканадаўству).

Як пазьней адзначаў доктар юрыдычных навук, прафэсар, былы член Канстытуцыйнага Суда Міхаіл Пастухоў, з „палажэньняў Канстытуцыі і законаў Рэспублікі Беларусь вынікае, што пытаньні, накіраваныя на зьніжэньне дзяржаўных гарантый існаваньня беларускай мовы, у тым ліку шляхам прыніжэньня яе ролі ў параўнаньні з іншымі мовамі, не могуць выносіцца на рэспубліканскі рэфэрэндум. Аналягічную выснову трэба зрабіць і адносна пытаньняў аб зьмене Дзяржаўнага сьцяга і Дзяржаўнага гэрба, як пытаньняў, якія замахваюцца на неад'емнае права беларускага народа на нацыянальную дзяржаўнасьць".

Нарэшце, артыкул 17 Канстытуцыі вызначаў беларускую мову як дзяржаўную, а расейскую – як мову нацыянальных зносін. Зьмена іх статусу азначала зьмену Канстытуцыі. Паводле артыкулу 148-2 Канстытуцыі, зьмена Канстытуцыі не магла праводзіцца ў апошнія шэсьць месяцаў паўнамоцтваў дзеючага Вярхоўнага Савета (а выбары новага ВС былі прызначаны ў адзін дзень з рэфэрэндумам, і калі б ВС –13 быў абраны ў поўным складзе, паўнамоцтвы ВС-12 скончыліся б не пазьней чым праз тры месяцы пасьля галасаваньня).

Такім чынам, вынясеньне пытаньняў аб мове і сымвалах парушала ***артыкулы 17, 78 і 148-2 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь**, а таксама **Закон „Аб народным галасаваньні (рэфэрэндуме)"***.

### Парушэньні у часе прызначэньня рэфэрэндуму

У адпаведнасьці з законам, рэфэрэндум павінен быў прызначаць Вярхоўны Савет (у той час – ВС 12-га скліканьня). ВС дзейнічаў у адпаведнасьці з Канстытуцыяй і шэрагам законаў, у тым ліку – Законам „Аб статусе дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь" і „Часовым Рэглямэнтам Вярхоўнага Савета".

У знак пратэсту супраць незаконнага рэфэрэндуму 19 дэпутатаў Вярхоўнага Савета (членаў Апазыцыі БНФ) раніцай 11 красавіка абвясьцілі галадоўку ў Авальнай залі. Пасьля гэтага тры пытаньні з чатырох, прапанаваных прэзыдэнтам, Вярхоўны Савет не зацьвердзіў (не набралася належнай колькасьці галасоў). У ноч з 11 на 12 красавіка (пасьля 2-ой гадзіны ночы), у будынак Вярхоўнага Савета былі ўведзеныя вайсковыя, міліцэйскія і спэцпадразьдзяленьні ( больш за 600 чалавек), дэпутаты былі зьбітыя групай асобаў у масках , закінутыя ў міліцэйскія аўтамабілі і выкінутыя ў цэнтры Менску (пры гэтым некаторыя былі ізноў зьбітыя). Факт зьбіцьця праз гадзіну быў зарэгістраваны супрацоўнікамі т.зв. „лечкамісіі"(па вул. Чырвонаармейскай) і пацьверджаны сьледчым па асабліва важных справах Генэральнай пракуратуры Я. Бролішсам (сьледзтву, аднак, не ўдалося ідэнтыфікаваць байцоў, якія непасрэдна зьбівалі дэпутатаў. Паводле пазьнейшага прызнаньня тагачаснага намесьніка старшыні КДБ, гэта былі афіцэры групы КДБ „Альфа").

Толькі пасьля зьбіцьця дэпутатаў Апазыцыі БНФ намэнклятурна-савецкая бальшыня Вярхоўнага Савета (зноў жа груба парушыўшы закон) зацьвердзіла пад ціскам чатыры пытаньні, прапанаваныя А. Лукашэнкам на рэфэрэндум.

Паводле прафэсара М. Пастухова, „толькі адзін факт скарыстаньня фізічнай сілы ў дачыненьні да дэпутатаў «людзьмі ў камуфляжнай форме» (ды яшчэ ў будынку парлямента!) ставіць пад сумненьне законнасьць пастановы Вярхоўнага Савета наконт прызначэньня рэфэрэндуму, паколькі рашэньне было прынятае пад прымусам. Само ж увядзеньне ўзброеных людзей у парлямант і нападзеньне на дэпутатаў можна кваліфікаваць як захоп улады гвалтоўным чынам".

Такім чынам, працэдура прызначэньня рэфэрэндуму адбывалася з парушэньнем, як мінімум, ***Закона „Аб статусе дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь"*** (паводле якога дэпутат зьяўляецца асобай недатыкальнай) і ***„Часовага Рэглямэнту Вярхоўнага Савета"***.

### Парушэньні ў часе агітацыі

Закон „Аб народным галасаваньні (рэфэрэндуме)" прадугледжваў атрыманьне грамадзянамі поўнай інфармацыі па пытаньнях, вынесеных на галасаваньне, а таксама роўныя магчымасьці агітацыі „за" і „супраць".

За некалькі тыдняў, якія папярэднічалі галасаваньню, па дзяржаўных тэле – і радыёканалах ішла суцэльная агітацыя ў падтрымку пазыцыі А.Лукашэнкі. На адным толькі тэлебачаньні працягласьць перадачаў з агітацыяй за пытаньні рэфэрэндуму, паводле маніторынгу, складала дзясяткі гадзінаў. Апанэнтам слова не далі. На 14-га траўня былі прызнача-

ныя таксама выбары ў Вярхоўны Савет 13-га склікання, і ў адпаведнасьці з заканадаўствам, кандыдаты мелі права на выступ у СМІ. Аднак у выступе кандыдатаў з эфіру выразалася ўсе словы, дзе яны выказваліся супраць прапанаваных А. Лукашэнкам пытаньняў рэфэрэндуму.

Нарэшце, перад галасаваньнем група дэпутатаў ВС (З. Пазьняк, Л. Баршчэўскі, С. Навумчык) зьвярнуліся з афіцыйным запытам да старшыні Дзяржтэлерадыёкампаніі Р. Кісяля з просьбай прадставіць 45 хвілінаў эфірнага часу 13-траўня для выказваньня сваёй пазыцыі па пытаньнях рэфэрэндуму і абвяржэньня інфармацыі, якая папярэдне прагучала ў фільме „Дзеці хлусьні". Эфір прадстаўлены ня быў, хаця гэта гарантавалася дэпутатам Законам „Аб статусе дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь".

Такім чынам, агітацыя ў пытаньнях рэфэрэндуму адбывалася з парушэньнямі ***Законаў „Аб народным галасаваньні (рэфэрэндуме)", „Аб выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь" і „Аб статусе дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь".***

### Парушэньні ў часе галасаваньня

Пад час самога галасаваньня назіральнікі (прычым афіцыйна зарэгістраваныя) зафіксавалі шматлікія парушэньні. Так, 21 траўня Сойм БНФ адзначыў, што „галасаваньне па рэфэрэндуме, асабліва ў сельскай мясцовасьці, было сфальсіфікавана выканаўчымі ўладамі і іхнімі прадстаўнікамі ў выбарчых камісіях.Пра гэта сьведчаць шматлікія факты, зарэгістраваныя назіральнікамі як ад Партыі БНФ, так і іншымі. Мы мелі сьведчаньні, што ў шмат якіх сельскіх акругах не прыйшла галасаваць і палова грамадзян, унесеных у сьпісы для галасаваньня. Колькасьць тых, хто прагаласаваў, была завышаная. І тым ня менш па другім і чацьвёртым пытаньні рэфэрэндуму (дзяржаўныя сымбалі і права прэзыдэнта распускаць парлямэнт. – С.Н.) прагаласавала „за" меньш за палову ад агульнай колькасьці выбаршчыкаў". Заўважым, што гэта была афіцыйная заява афіцыйна зарэгістраванай партыі, перададзеная ў ЦВК і не абвергнутая ЦВК.

Такім чынам, паводле назіральнікаў, галасаваньне адбывалася з парушэньнем ***Закона „Аб народным галасаваньні (рэфэрэндуме)"***.

### Зацьвярджэньне вынікаў

Прыкметна, што Вярхоўны Савет 12-га склікання, нягледзячы на тое, што пасьля рэфэрэндуму выконваў функцыі вышэйшага заканадаўчага воргану краіны яшчэ амаль восем месяцаў (у выніку таго, што ВС 13-га скліканьня ня быў своечасова абраны, ягоныя паўнамоцтвы скончыліся 8-га студзеня 1996 г.), – не зацьвердзіў вынікаў травеньскага рэфэрэндуму. Гэта зрабіў толькі Вярхоўны Савет 13-га скліканьня.

***Такім чынам, у часе прызначэньня і правядзеньня рэфэрэндуму 1995 г. былі парушаныя, як мінімум, артыкулы 17, 78 і 148 ч. 2 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Законы „Аб народным галасаваньні (рэфэрэндуме)", )", „Аб выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь", „Аб статусе дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь", а таксама „Часовы Рэглямэнт Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь".***

***Сяргей Навумчык (Радыё Свабода)***

*Травень, 2009 г.*

## ІГУМЕНЬСКІ ШЛЯХ

28 чэрвеня сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ правялі штогадовыя мэмарыяльныя мерапрыемствы памяці ахвяраў расейскага генацыду ў горадзе Чэрвені (былы Ігумень) Менскай вобласьці. Вялікая група сяброў Партыі прыбыла з Менска і распачала мерапрыемствы каля будынка былой Ігуменьскай турмы, дзе расейскія акупанты, пачынаючы з 19-га стагоддзя, вязьнілі і катавалі беларускіх патрыётаў. У гэтай вязьніцы каты НКВД трымалі людзей апошнюю ноч перад расстрэлам 26 чэрвеня 1941 г., пасьля таго, як прыгналі іх зь менскай турмы. Расейцы падзялілі вязьняў на „крымінальных" і „палітычных" і адпусьцілі асуджаных па



***9. Ігуменьскі шлях. Фронтаўцы КХП – БНФ на расстрэльнай дарозе каля Ігуменя.***

крымінальных артыкулах. На наступны дзень акупанты пагналі калёну вязьняў па шашы ў бок Расеі і непадалёк ад Чэрвеня адкрылі агонь па людзях. Было забіта больш за паўтары тысячы чалавек. Толькі нямногія здолелі ўцячы і выратавацца. Злачынства маскоўскага захопніка наклалася на злачынства нямецкага захопніка.

Фронтаўцы прайшлі шляхам беларускіх пакутнікаў пад нацыянальнымі Бел-Чырвона-Белымі Сьцягамі і Гербам Пагоня. На магілах ахвяраў былі ўскладзены вянкі і кветкі, запаленыя сьвечкі. Людзі засьпявалі гімн „Магутны Божа". Перад грамадой выступілі сп. Юры Беленькі, выканаўца абавязкаў у Беларусі старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне" і КХП-БНФ, і сп. Алесь Чахольскі, адказны сакратар Фронту і Партыі. Яны казалі пра неўмяручасьць народнай памяці, якая не дазваляе ворагам Беларусі сфальшаваць нашу гісторыю і наш народны лёс. Маскоўская імпэрыя ня толькі забіла мільёны нашых людзей. Крэмль ізноў спрабуе выставіцца вызваліцелем і выратавальнікам беларускага народу і ўсяго чалавецтва. Але сьвятыя магілы ў Курапатах, Ігумене і іншых месцах пакутніцтва нашага народу ёсьць вечным сьведчаньнем крамлёўскага злачынства. Яны не пакаяліся і зноў сунуцца на нашу зямлю з сваімі арміямі, ФСБ-НКВД, стукачамі, пьянствам і наркаманіяй. У імя сьветлай памяці аб нашых ахвярах і дзеля сьветлага жыцьця будучых пакаленьняў мы павінны абараніць нашу Айчыну ад чарговага нашэсьця.

Выступілі таксама маладыя беларусы, якіх шмат было на сёлетніх мерапрыемствах. Некаторыя зь іх упершыню наведалі гэтыя мясьціны і былі ўсхваляваны ўбачаным і пачутым. Яны казалі пра выбар, што вельмі выразна паўстае перад моладдзю. Далучацца да народнага супраціву расейскай агрэсіі або да БРСМ і антыбеларускай хеўры, служыць роднай культуры або ўдаваць з сябе „русскоязычного", жыць вольна на сваёй зямлі або усё жыцьцё прыстасоўвацца да чарговых акупантаў і гвалтаўнікоў. Маладыя заклікалі сваіх равесьнікаў успрымаць ня толькі словы палітычных прадстаўнікоў, але перш за ўсё глядзець на іхныя справы.

***Інфармацыйная камісія***
***Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ. (В. Буйвал)***

*28 чэрвеня 2009 г.*

## БАРАЦЬБА ЗА НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ

**Калі я ўпершыню зайшоў у Авальную залю, адчуў тое, што, напэўна, адчувае асуджаны на сьмерць, калі яго ставяць перад растрэльнай камандай. У вачах – нянавісьць, у манерах – упэўненасьць у абсалютным валоданьні тваім лёсам; хіба што зброяй былі ня стрэльбы, а кнопкі для электроннага галасаваньня. Затое не дзесятак чалавек, а – амаль трыста.**

Дэпутаты БНФ складалі толькі 8 працэнтаў ад агульнай колькасьці Вярхоўнага Савета. Наша перавага перад сьмяротнікамі была ў тым, што можна было павярнуцца і сысьці. Але прыйшлося перамагчы эмоцыі і працаваць.

## Пракамуністычны парлямэнт

Зразумець складанасьць прыняцьця Дэкляраціі аб дзяржаўным сувэрэнітэце і, шырэй, аднаўленьня Незалежнасьці Беларусі немагчыма бяз тлумачэньняў раскладу палітычных сілаў ў пачатку 90-ых гадоў, пра якія ні сучасныя падручнікі гісторыі, ні афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі аб'ектыўна не гавораць.

На сакавіцкіх выбарах 1990 году ў Вярхоўны Савет БССР 12-га скліканьня Беларускі Народны Фронт выставіў сваіх кандыдатаў па большасьці з 310 акругаў (усяго было 360 мандатаў, але 50 дэпутатаў абіраліся, ці, лепш казаць, прызначаліся арганізацыяй ветэранаў, таварыствамі інвалідаў, сьляпых і глухіх). Прадбачачы іранічныя ўсьмешкі, адразу скажу, што большасьць дэпутатаў ад трох апошніх таварыстваў потым засьведчылі свае дэмакратычныя перакананьні і зрабіліся сапраўднымі прафэсійнымі парламэнтарыямі; дэпутаты ж ад вэтэранскай арганізацыі, колькасьцю у 30, вызначаліся гранічным непрыняцьцем усяго прагрэсіўнага. Яны да апошняга дня існаваньня ВС 12 скліканьня шалёна ненавідзелі ўсё беларускае – магчыма, таму, што ў большасьці былі рускімі па нацыянальнасьці. Гэта былі пэнсіянэры – былыя партыйныя работнікі, генэралы, вэтэраны КДБ. Яны блякавалі ўсе прапановы Апазыцыі БНФ. Гэтыя трыццаць дэпутатаў адыгралі чорную ролю ў найноўшай гісторыі Беларусі.

Народнаму Фронту ўдалося правесьці ў Вярхоўны Савет каля дваццаці сваіх кандыдатаў. Партыйныя (натуральна ж, камуністычныя) камітэты кантралявалі выбары, адмоўна паўплывалі і паклёпніцкія артыкулы, зьмешчаныя ў афіцыйных газэтах за дзень да выбараў, калі ўжо не было магчымасьці абвергнуць хлусьню.

Сапраўды, першы дзень у Авальнай залі пакінуў незабыўныя успаміны. Гэтыя некалькі сотняў партыйных сакратароў, старшыняў выканкамаў, дырэктараў прадпрыемстваў «сацыялістычнай вытворчасьці» падаліся ў нечым вельмі падобнымі; да таго ж, ці то выпадкова, ці то з нейкай невядомай мне прычыны, але практычна ўсе яны былі ў аднолькавых сьветла-блакітных касьцюмах. Жанчын было няшмат. Адна ветэранка, з зоркай Героя сацыялістычнай працы, паказала на мяне пальцам:

– Посмотрите, «бэнээфовец» такой молодой, а с бородой, что он этим хочет сказать?

Між іншым адзначу, што ці не галоўнай перашкодай ва ўсталяваньні ўзаемаразуменьня з апанентамі быў якраз наш малады ўзрост – мне было 28 гадоў, Мікола Маркевіч, Ігар Гермянчук, Юрась Беланькі, Лявон Баршчэўскі былі равесьнікамі плюс-мінус год, Валянціну Голубеву, Лявонцію Зданевічу, Вользе Галубовіч, Сяргею Антончыку, ды, бадай, большасьці дэпутатаў будучай апазыцыі не было і 35-ці. Саракашасьцігадовы Зянон Пазьняк здаваўся нам ў той час калі не старым, дык нешта блізка да таго. Праз некалькі тыдняў «ўзроставы бар'ер» зьнік.

## Ня сіла аргумэнтаў, а сіла арыфмэтыкі

Ужо з першых дзён сэсіі дэпутатам БНФ прыйшлося ўступіць у супрацьстаяньне з пракамуністычнай большасьцю. Спачатку спрэчка ішла за пасаду старшыні Вярхоўнага Савета. ЦК КПБ вылучыла на гэтую пасаду былога сакратара ЦК па сельскай гаспадарцы Мікалая Дземянцея. Ужо пасля першых фраз Мікалая Іванавіча ўзьнікала пытаньне: як такі чалавек мог зрабіць кар'еру большую, чым заатэхнік калгасу? Дземянцей, па-просту, ня мог гаварыць. Ён будаваў сказы, у якіх словы часам не стасаваліся па родах і ліках, утрымлівалі супярэчлівыя пазыцыі ў межах аднаго сказу. І самая знакамітая ягоная фраза – «Кто как хотіт, тот так і говоріт» – выявіла інтэлектуальны ўзровень фармальнага кіраўніка БССР і надоўга прыклеілася да Дземянцея.

Мы разумелі, што Пазьняк ня будзе абраны гэтым дэпутацкім корпусам на пасаду старшыні ВС (цяпер я думаю, што, ўсё ж, трэба было вылучаць яго нават пры заведама непрахадным варыянце, каб ён змог агучыць канцэпцыю дасягненьня сувэрэнітэту на мільённую аўдыторыю; дэбаты з Авальнай залі вяліся ў прамой радыётрансляцыі). Таму спыніліся на двух кампрамісных кандыдатах: прарэктары БДУ, народным дэпутаце СССР Станіславе Шушкевічы і касманаўце Уладзіміру Кавалёнку. У той момант Кавалёнак выказваў дэмакратычныя перакананьні, а дзьве залатыя зоркі Героя Савецкага Саюза і пагоны генэрал-лейтэнанта істотна ўскладнялі спробы камуністычнай большасьці навешаць на яго шыльду «бэнээфаўца». У выніку Кавалёнак саступіў месца Шушкевічу, якому і давялося змагацца за пасаду спікера з Дземянцеем.

Калі падліковая камісія абвясьціла вынікі галасаваньня (большасьць, як і варта было чакаць, набраў Дземянцей), Народны Фронт вывеў да Дому ўраду дзесяць тысяч чалавек. На наступны дзень нам удалося, спалучаючы тактыку ціску і кампрамісаў, прымусіць Дземянцея зьняць прапанаваную ім на пасаду свайго першага віцэ-спікера кандыдатуру намесьніка старшыні Гродзенскага аблвыканкаму Машко і пагадзіцца з прызначэньнем на гэтую стратэгічна важную пасаду Станіслава Шушкевіча (заўважу, што адразу пасьля гэтага Станіслаў Станіслававіч чамусьці перастаў наведваць пасяджэньні дэмклюбу і імкнуўся дыстанцыявацца ад БНФ).

Далей ішла ня менш вострая барацьба за пасаду старшыняў парламенцкіх камісіяў (яны, па Канстытуцыі, уваходзілі ў склад Прэзыдыюму ВС). БНФ вылучыў практычна на кожную пасаду сваіх прадстаўнікоў (кіраўніком планава-бюджэтнай камісіі – Юрася Беленькага, камісіі па міжнацыянальны станусках – Лявона Баршчэўскага, па міжнародных адносінах – Пётру Садоўскага і г.д.). Гэта давала магчымасьць пад час абнародваньня праграмы і дэбатаў данесьці да насельніцтва сваю пазыцыю практычна ў кожны беларускі дом, чаго БНФ раней быў пазбаўлены (але даволі хутка камуністы спахапіліся і спынілі прамую трансьляцыю).

Аднак праграмы і аргумэнты, выказаныя дэпутатамі БНФ, у Авальнай залі не браліся пад увагу: для камуністычнай большасьці галоўным было, як у супрацьпаветранай абароны, вызначэньне «наш» – «ня наш». Ня «іхнія» – бязьлітасна зьбіваліся. Парадаксальна, але адукаванасьць кандыдатаў разглядалася як кампрамат. Анэкдатычны аргумент прагучаў, калі абмяркоўвалі Садоўскага на пасаду старшыні камісіі па міжнародных адносінах: «Спадар Садовский вместо чтобы сделать что-то полезное для народа, изучил пять иностранных языков!».

Садоўскі якраз быў абраны старшынём міжнароднай камісіі і стаў адзіным дэпутатам БНФ у складзе Прэзыдыюму ВС, у астатнім жа нашыя кандыдаты «рэзаліся» пры галасаваньні. Не праходзілі і «кампрамісныя» фігуры (так, на пасаду старшыні аграрнай камісіі быў забалатаваны ня толькі прапанаваны дэпутатамі БНФ Лявонцій Зданевіч, але і «ўмераны» старшыня саўгасу «Гарадзец» Шклоўскага раёну дэпутат Лукашэнка. (У тыя дні Лукашэнка рэгулярна наведваў пасяджэньні дэмклюбу, праўда, я не памятаю, каб выступаў з найкімі прапановамі. Звычайна – маўчаў і слухаў).

Пад час выпрацоўкі канцэпцыяў, прадстаўленых нашымі кандыдатамі, выбудоўвалася мадэль рэалізацыі сувэрэнітэту – у эканоміцы, у фінансавай сфэры, у міжнародных дачыненьнях. Але самым прынцыповым было стварэньне дзяржаўных атрыбутаў і інстытуцыяў, якія павінна мець незалежная дзяржава – ўласная фінансавая сыстэма, уласнае войска, самастойная міжнародная палітыка. Якраз гэта абсалютна не ўспрымалася парламенцкай большасьцю.

## БНФ патрабуе Незалежнасьці

Яшчэ 11 траўня 1990 году Сойм БНФ заявіў пра незалежнасьць Беларусі як палітычную мэту, а ў канцы таго месяца БНФ правёў агульнанацыянальную канфэрэнцыю «Незалежная Беларусь» з удзелам больш як шасьцідзесяці дэмакратычных дэпутатаў усіх ўзроўняў (ад Вярхоўнага да раённых Саветаў). Асноўны даклад зрабіў Пазьняк.

Распрацаваны БНФ праект Дэкляраціі аб сувэрэнітэце ў чэрвені 1990 году быў прапанаваны Вярхоўнаму Савету.

Калі Пазьняк казаў на сэсіі ВС пра сувэрэнітэт Беларусі як менавіта абвяшчэньне незалежнай дзяржавы, большасьць дэпутатаў слухала яго так, як бы ён абвясьціў, што ў Менск прыляцелі прадстаўнікі іншай галактыкі, і вось толькі што ён зь імі размаўляў. На тварах дэпутатаў чыталася ці ня ўся гама пачуцьцяў – ад зьдзіўленьня да сарказму. Эканамічная самастойнасьць

яшчэ ўспрымалася (сакратарам і дырэктарам надакучыла выпрошваць на кожную дробязь дазвол Масквы), а вось уласныя грошы, уласнае войска – не, гэта было па-замежмі іх разуменьня. ***Антыбеларускія беларусы***

У гэтым, між іншым, была трагедыя Беларусі: у адрозьненьне ад Літвы, дзе сувэрэнітэту патрабавалі ў Гарбачова сакратары ЦК кампартыі Летувы, ці Эстоніі, дзе ЦК кампартыі Эстоніі падтрымаў ня толькі свой Народны Фронт, але дапамагаў іншым, ці хаця б Украіны, дзе сакратары ЦК і абкамаў паміж сабой размаўлялі па-украінску нават у савецкія часы, – партыйнае кіраўніцтва Беларусі на 99,99 адсоткаў не ўспрымала нацыянальныя інтарэсы як свае. Як прыклад – з дакумэнтаў выкрэсьліваліся словы «беларускі», «нацыянальны».

І гэта пры тым, што практычна ўсё кіраўніцтва, практычна ўвесь партыйны апарат быў этнічнага беларускага паходжаньня. Аднак у 1988 годзе гэты партапарат распачаў маштабнае цкаваньне толькі што ўтворанага БНФ і яго старшыні менавіта з-за «нацыяналізму», у «нацыяналізме» на «адзіных палітднях» абвінавачвалі і Васіля Быкава. Неверагодна, але пасьля адстаўкі сакратара ЦК Кузьміна адзіным «адвакатам» Быкава ў кіраўніцтве быў прысланы з Масквы другі сакратар ЦК КПБ расеяц Ігруноў – сакратары-беларусы патрабавалі «крыві» народнага пісьменьніка за тое, што асьмеліўся выступіць у абарону беларускіх каштоўнасьцяў.

Такім чынам, дасягнуць нашай мэты нам было ўдвая складаней, чым літоўцам ці украінцам: тым даводзілася змагацца толькі з Масквой, нам жа – яшчэ і з нацыянальным нігілізмам «свайго» кіраўніцтва, усяго партыйна-дзяржаўнага апарату. Але Масква была далёка, а свае – тут, побач. Самыя зацятыя праціўнікі Незалежнасьці, самыя апантаныя змагары з нацыянальнымі каштоўнасьцямі – былі беларускія камуністы.

## Пазьняк прапануе пагутарыць «нефармальна»

Спачатку Вярхоўны Савет адрынаў саму ідэю прыняцьця дэклярацыі аб сувэрэнітэце. Пасьля таго, як падобныя дэклярацыі прынялі Украіна і Расея, Дземянцей заявіў, што і Беларусь павінна зрабіць аналагічны крок (і нават афіцыйную парляманцкую камісію стварылі). Такая дыямэтральна супрацьлеглая зьмена пазыцыі тлумачыцца проста: Прэзыдэнт СССР Гарбачоў змагаўся са старшынём ВС РСФСР Ельцыным і яму было аб'ектыўна выгодна «размыць» расейскую дэклярацыю дэклярацыямі іншых рэспублік; пры гэтым ён нічога не губляў, бо Канстытуцыі ўсіх рэспублік і раней утрымлівалі фразу пра сувэрэнітэт, а ў дэклярацыі прапаноўвалася ўключыць пункт аб падпісаньні новай саюзнай дамовы. Менавіта такі варыянт і меў на ўвазе Дземянцей.

Але – для нас гэта быў шанец. Мы палічылі неабходным скарыстаць яго максымальна, прапанаваўшы такія палажэньні, якія б канстытуцыйна замацавалі сувэрэнітэт і дазволілі распачаць будаўніцтва незалежнай дзяржавы.

У камуністаў не было ніякага праекту – у нас праект Дэклярацыі быў падрыхтаваны. Гэта, бясспрэчна, было вялікім плюсам, але вопыт абраньня старшыняў камісіяў паказваў, што пры галасаваньні ўсё вырашалі не аргумэнты, а арыфмэтычная большасьць галасоў.

*Уласна, мы мелі два варыянты дзеяньняў.* Першы – прапанаваць Вярхоўнаму Савету на пленарным паседжаньні наш праект, абгрунтаваўшы ягоныя палажэньні. Найхутчэй, камуністычная большасьць яго б адразу адрынула толькі таму, што яго прапанавалі дэпутаты БНФ.

Другі – прапанаваць праект спачатку ў адпаведнай камісіі, якую ўзначальваў дэпутат Козік (той самы, які цяпер пастаўлены Лукашэнкам кіраваць афіцыйнымі прафсаюзамі). Пераканаць дваццаць членаў камісіі значна прасьцей, чым трыста дэпутатаў, і калі ў выніку праект будзе ўнесены на сэсію ВС ад імя афіцыйнай камісіі, ён мае значна больш шанцаў быць прыняты.

Мы абралі другі варыянт.

Пасьля заканчэньня аднаго з паседжаньняў ВС Пазьняк прапанаваў усім жадаючым застацца ў Авальнай залі, каб «неафіцыйна» абмеркаваць сытуацыю. Сабралося некалькі дзясяткаў дэпутатаў (можа, восемьдзесят) у сэктары ўраду і Менскай дэлегацыі (правы бок Авальнай залі, калі стаяць тварам да прэзыдыюму). Нашыя дэпутаты – гісторыкі (Пазьняк, Голубеў, Трусаў) распавялі пра гісторыю ВКЛ і БНР. І для большасьці тое, што Беларусь калісьці мела пэрыяды незалежнасьці, было адкрыцьцём.


*10. Сяргей Навумчык. 90 –я гг.*

А далей пачалася праца ў камісіі Козіка. Дэбаты былі бурныя, але, як ні дзіўна, з большага нашыя прапановы былі прынятыя. Яшчэ больш дзіўным для шмат каго было тое, што асноўныя палажэньні Дэклярацыі ад імя камісіі прадстаўляў не яе афіцыйны старшыня, а Зянон Пазьняк.

## Цяжкае галасаваньне

Найбольш вострыя дэбаты па Дэклярацыі аб сувэрэнітэце былі 26-га і 27-га ліпеня.

Наш практ прынялі ў цэлым. Але пры паартыкульным абмеркаваньні даводзілася змагацца ня тое што за кожную фармулёўку – за кожнае слова ў нашых фармулёўках.

Словы пра «пераемнасьць дзяржаўнай ідэі БССР ад Беларускай Народнай Рэспублікі і неабходнасьць рэспубліканскай парламенцкай формы праўленьня» – выкідаюцца.

Слова пра назву «Беларуская Рэспубліка, альбо Беларусь» – выкідаюцца, застаецца БССР.

Словы пра тое, што «усе віды маёмасьці зьяўляюцца ўласнасьцю грамадзян БССР» (а не Масквы) – выкідаюцца.

Словы пра стварэньне ўласнай грашовай сыстэмы – выкідаюцца. Але пагаджаюцца ўтварыць Нацыянальны банк. Праходзіць і нашая прапанова аб праве Беларусі на сваю долю ў «саюзным» алмазным і валютным фондах і залатым запасе.

Мая прапанова аб дэманапалізацыі СМІ належнай колькасьці галасоў не набірае.

Затое прымаецца прапанова Пазьняка, што «сваю свабоду і сувэрэнітэт Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка ў першую чаргу выкарыстоўвае на выратаваньне беларускага народу ад вынікаў Чарнобыльскай катастрофы».

Не праходзіць фармулёўка пра тое, што «Беларуская ССР мае права на ўласныя Ўзброеныя Сілы, унутраныя войскі, органы дзяржаўнай і грамадзскай бясьпекі, падначаленыя Вярхоўнаму Савету» – першым супраць выступае дэпутат Віктар Ганчар. Яго падтрымлівае намесьнік Старшыні КДБ Генадзь Лавіцкі.

Даволі хутка дэпутацкая большасьць разумее, што працэс, дзякуючы націску дэпутатаў БНФ, ідзе «не туды», куды ім хацелася б. У нейкі момант старшыня камісіі ВС Леанід Козік заяўляе, што «если мы примем эту Декларацию, то она направлена на сто процентов на выход из Союза». Што, канешне, было праўдай.

І вось – апошні артыкул. Большасьць дэпутатаў застаецца непахіснай у сваім жаданьні прадэкляраваць падпісаньне «Саюзнай дамовы». Слова бярэ дэпутат БНФ Уладзімер Заблоцкі, які ў складзе беларускай дэлегацыі па падрыхтоўцы гэтай самай «саюзнай дамовы» наведваў Маскву.

Па праекце гэтай «саюзнай дамовы» Масква пакідала сабе ў Беларусі права на: міжнародную палітыку, войска, дзяржбясьпеку, памежныя войскі, мытню, юрыдычныя інстытуцыі, ваенную прамысловасьць, энэргетычную сыстэму, пераапрацоўку нафтапрадуктаў, газавыя і нафтавыя трубаправоды, крэдытна-фінансавую і банкаўскую сыстэмы, чыгуначны транспарт, паветраны транспарт, тэлебачаньне, радыё, фундамэнтальную навуку... Словам, нам заставаўся хіба Чарнобыль.

Але і гэта не ўспрымалася аргумэнтам для парляманцкай большасьці. Не жадалі дэпутаты і надаць Дэклярацыі статус канстытуцыйнай сілы. Для нас гэта было прынцыпова важным, бо такі статус ставіў Канстытуцыю і законы Беларусі вышэй за Канстытуцыю і законы СССР, і гэта якраз і азначала юрыдычную Незалежнасьць.

Ніякія нашыя аргумэнты не ўспрымаліся.

Больш за тое: ўзьнікла рэальная пагроза перагляду ўжо прынятых артыкулаў і выхалошчваньня з Дэклярацыі ўсяго, што нам удалося правесьці.

### Выйсьці, каб перамагчы

І тады Пазьняк прапанаваў тактычны крок, які спачатку падаўся шмат каму з нас натуральнай авантурай. Пазьняк прапанаваў апэляваць не да розуму дэпутацкай большасьці, а, скажам гэтак, да калектыўнага інстынкту, скарыстаўшы ўжо выпрацаваную звычку галасаваць насуперак БНФ.

«Паважаныя дэпутаты, – пачаў свой выступ Пазьняк на сэсіі, – я не затрымаю доўга вашай увагі. Тое, што мы зараз пачулі зьвесткі, што нам рыхтуе «саюзны дагавор», і тое, што зараз сэсія прагаласавала за гэты «саюзны дагавор», гэта тое самае, што сунуць галаву ў пятлю. Гэта значыць, што далейшая размова аб сувэрэнітэце ня мае сэнсу. Гэта значыць, што наша праца два дні была без патрэбы. На вялікі жаль, народныя дэпутаты, відаць, мы ўсё ж такі не дарасьлі да сувэрэнітэту. Таму я, Пазьняк Зянон Станіслававіч, заяўляю, што я адмаўляюся далей удзельнічаць у гэтай сэсіі ў выніку таго, што Вярхоўны Савет ня здольны прыняць Дэклярацыю аб сапраўдным сувэрэнітэце. Тых дэпутатаў, якія мяне падтрымліваюць, прашу зрабіць тое самае. Я пакідаю залю».

З Авальнай залі выйшла трыццаць дэпутатаў (аднак некалькі дэпутатаў БНФ, у тым ліку і аўтар гэтых радкоў, былі пакінутыя ў залі).

Заява Пазьняка і выхад з залі выклікалі ў прысутных шокавы эфэкт сваёй нечаканасьцю. Але значна больш моцнымі было жаданьне зрабіць насуперак – як перад гэтым на сэсіі заўважыў Ігар Гермянчук, некаторыя галасуюць «супраць» толькі таму, што Пазьняк галасуе «за».

Перад выхадам з залі мы абмяркоўвалі гэты крок, нам ён падаваўся вельмі рызыкоўным. Найбольш рызыкаваў, канешне, Пазьняк: калі б у выніку Дэклярацыя не была б прынятая (скажам, не хапіла галасоў) – на ягоным палітычным аўтарытэце, ды і на аўтарытэце ўсяго Народнага Фронту можна было б ставіць крыж.

Але адбылося так, як разьлічваў Пазьняк: дэпутаты заявілі, што поўныя рашучасьці прыняць Дэклярацыю і пачалі актыўна галасаваць. Ня ведаю, чаго тут у Пазьняка было болей: дакладнага палітычнага разьліку, адчуваньня псыхалёгіі ці проста інтуіцыі.

Раз-пораз чуюцца сьцвярджэньні: «Апазыцыя БНФ не брала ўдзел у галасаваньні па Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце», – і на гэтым ставіцца кропка, маўляў, дэпутаты БНФ ня маюць да яе дачыненьня. Праўдай жа застаецца тое, што дэпутаты БНФ напісалі праект гэтай Дэклярацыі. Мы галасавалі па кожным яе артыкуле, і толькі ў заключныя дні, 26-27 ліпеня, выступілі на сэсіі больш за сто разоў! Нарэшце, некалькі дэпутатаў БНФ былі ў залі пры канчатковым галасаваньні.

Да слова, нам з дэпутатам Шачакам удалося правесьці фармулёўку, што Беларусь «мае права на ўласныя Ўзброеныя сілы, ўнутраныя войскі, органы дзяржаўнай бясьпекі, падкантрольныя Вярхоўнаму Савету», прычым за гэта прагаласавала 230 дэпутатаў!

І хаця абвяшчэньне Беларусі бяз'ядзернай зонай не прайшло – 229 чалавек прагаласавалі за тое, што Беларусь «ставіць на мэце зрабіць сваю тэрыторыю бяз'ядзернай зонай, а рэспубліку – нейтральнай дзяржавай». Для мяне асабіста гэта было справай гонару, бо за два гады да гэтага нам у Віцебску ўдалося перашкодзіць плянам будаўніцтва АЭС.

Прыняла парлямэнцкая большасьць і фармулёўку пра «поўны сувэрэнітэт», якую прапанаваў Анатоль Вярцінскі, рэдактар штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», бадай што самай прагрэсіўнай на той час газэты.

У выніку за Дэклярацыю аб дзяржаўным сувэрэнітэце БССР прагаласавалі 229 дэпутатаў – значна больш, чым патрабавалася для яе прыняцьця.

### У ЗША – вывучаюць, у Беларусі – замоўчваюць

І ўсё ж гэта яшчэ не была тая Незалежнасьць, пра якую марылася – толькі праз год, 25 жніўня, на скліканай па патрабаваньню Апазыцыі БНФ надзвычайнай сэсіі Вярхоўнага Савета Дэкларацыі будзе нададзены статус канстытуцыйнай сілы, і Беларусь стане незалежнай «дэ-юрэ». За гэты год паміж 27 ліпеня 90-га і 25 жніўня 91-га Апазыцыя падрыхтавала некалькі дзесяткаў законапраектаў, якія потым ляглі ў падмурак беларускай дзяржаўнасьці. Гэтых месяцаў шмат каму хапіла дзеля асэнсаваньня бесперспэктыўнасьці існаваньня імпэрыі, і таму ў жніўні 91-ага, каб падтрымаць нас, на плошчу перад Домам ураду выйшлі некалькі дзясяткаў тысяч чалавек.

Вось чаму не вытрымлівае ніякай крытыкі тэорыя, што нібыта «Незалежнасьць звалілася на беларусаў зьнянацку, як зь неба». Тыя, хто гэтак кажа, забываецца (а хутчэй, па-просту ня хоча ведаць) ні пра Тадэвуша Рэйтана, які ў 1772-ім годзе лёг перад дэпутатамі Сойму, каб перашкодзіць пераходу Усходніх беларускіх земляў у панаваньне расейскага цара. Ні пра паплечнікаў Тадэвуша Касьцюшкі – ўдзельнікаў антыцарскага паўстаньня 1784-га. Ні пра паўстаньне 1863-га году Кастуся Каліноўскага. Ні пра Слуцкі збройны чын, чые ваяры пацьвердзілі на сваёй тэрыторыі вяршэнства БНР і некалькі месяцаў адбівалі атакі бальшавікоў. Ні пра актывістаў Саюзу беларускіх патрыётаў на Пастаўшчыне і Глыбоччыне, якія ў канцы 1940-ых гадоў выступілі супраць русыфікацыі, трымалі ў сябе Бел-Чырвона-Белыя сьцягі і за гэта правялі шмат гадоў у мардоўскіх канцлягерах.

Тое, што ўдалося зрабіць актывістам БНФ (я маю на ўвазе ня толькі дэпутатаў, але тысячы прыхільнікаў Народнага Фронту ў Менску і ў рэгіёнах) у 1990-1991 гадах – гэта заканамерны вынік змаганьня пакаленьняў беларусаў за Незалежнасьць. У Злучаных Штатах за двесьце гадоў пра іхнюю Дэклярацыю аб незалежнасьці напісана безьліч кніг (ва ўсялякім разе, каталёг Бібліятэкі Кангрэсу ЗША налічвае тысячы і тысячы выданьняў). У сёньняшняй Беларусі пра нашу Дэклярацыю імкнуцца ня ўзгадваць.

Прывяду, аднак, словы Васіля Быкава: «Што ж датычыцца апазыцыі ў Вярхоўным Савеце, то я думаю, што ў тых умовах, у той час менавіта апазыцыя Беларускага Народнага Фронту зрабіла гераічны ўчынак з таго, што дамаглася менавіта гэтай сувэрэннасьці. Гэта яе заслуга. І чым далей, незалежна ад таго, чым гэта скончыцца, незалежна ад лёсу Беларусі навогул, у гістарычным вымярэньні гэта будзе вельмі значна, гэта будзе ацэнена праз вякі».

***Сяргей НАВУМЧЫК***

*http://naviny.by/rubrics/politic/2009/07/27/ic_articles_112_163747/*

## ГАНС ВІК – ПАДВОЙНАЕ ДНО

Пасьля зьяўленьня на Беларусі (канец 1997 г.) кіраўнік Менскай місіі АБСЭ Ганс-Георг Вік пачаў фармаваць „аб'яднаную апазыцыю". Ён пачаў зьбіраць прадстаўнікоў апазыцыйных партыяў (і вельмі сумніўна апазыцыйных, кшталту Абрамавай і Гайдукевіча) у IBB (нямецкім цэнтры). Паседжаньні праходзілі пад лёзунгам „падрыхтоўка перамоўнага працэсу з рэжымам". Была створана „экспэртная група". Падчас паседжаньняў абмяркоўвалася „плятформа", зь якой „аб'яднаная апазыцыя" выйдзе на перамовы з рэжымам. Ужо тады адчувалася нейкая недагаворанасьць падчас гэтых абмеркаваньняў. Увесь час было адчуваньне, што **Лябедзька**, **Калякін**, **Вячорка**, **Статкевіч**, **Гайдукевіч** без шматлікіх словаў, адной рэплікай перакінуўшыся, разумелі адзін аднаго, а часам, пачаўшы гаварыць, раптам спыняліся, як бы баючыся сказаць лішняе.

Прычына такіх паводзінаў стала зразумелай пасьля выступу (у сярэдзіне сакавіка 2000-га года) па Беларускім тэлебачаньні „палатніка" Жушмы. Ён проста расказаў, што ўжо год „апазыцыя" вядзе таемныя перамовы з прадстаўнікамі рэжыму ў півярні „Ракаўскі бровар" пры пасярэдніцтве Віка. „Напрыклад, – сказаў Жушма, – учора былі Лябедзька, Статкевіч, прадстаўнікі БНФ ды іншыя".

На наступны дзень перад паседжаньнем „аб'яднанай апазыцыі" у прысутнасьці чалавек, здаецца, васьмі я запытаўся ў спадара Віка: „Ска-

жыце, калі ласка, хто з сяброў БНФ быў заўчора на згаданым Жушмам паседжаньні?”

– Я ня памятаю, – коратка адказаў Вік.

Тут адчыняюцца дзьверы – уваходзіць Лябедзька. „Анатоль, – пытаюся я, – хто ад БНФ быў заўчора разам з табой у „Ракаўскім бровары”?

– Вячорка і Хадыка, – проста адказаў ён.

Адразу ж пасьля слоў Лябедзькі ўваходзіць Вячорка.

– Вінцук, – кажу, – дык раскажы, аб чым ты заўчора дамаўляўся з лукашыстамі ў „Ракаўскім бровары”?

І тут зусім нечаканая для мяне рэакцыя Вячоркі. З абурэньнем, часта дыхаючы, на павышаных танах ён выгукнуў: „Гэта ўсё хлусьня, я там ніколі ня быў!”

І сьледам – спакойныя словы, здаецца, Аляксея Караля: Вінцук, маўляў, цішэй. Лябедзька ўсё расказаў. Вінцук замаўкае, сядае на сваё месца. Пачынаецца паседжаньне. Сядзеў ён за сталом насупраць мяне. Я ня вытрымаў і зь лёгкім сарказмам пытаюся , кшталту, ці добрае піва падавалі ў „Бровары”? І тут жа ў адказ даволі гучна чую: „Калі ты дзе-небудзь яшчэ пра гэта скажаш, мы знойдзем спосаб з табой разабрацца”. (Як кажуць, зьдзіўленьню майму не было канца – такое пачуць ад акуратнага Вінцука)*

Прынамсі, як я потым даведаўся, Хадыка прысутнічаў на таемных перамовах у якасьці „экспэрта”. Сутнасьць жа ўсяго, што тады адбывалася, пазьней (у 2004-м) раскрыў спадар Вік у сваім інтэрв'ю ў „Белорусской газете”, маўляў, усе гэтыя „перамовы” ўзгадняліся ў беларускім КГБ, а грошы выдзеліў Эўразьвяз.

***Юры БЕЛЕНЬКІ***

*Красавік 2009 г.*

# ПРЭЗЭНТАЦЫЯ НОВАЙ КНІГІ ЗЯНОНА ПАЗЬНЯКА „НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЬЦІ”

28 чэрвеня 2009 г. у грамадзкай залі царквы сьвятога Кірылы Тураўскага ў Брукліне адбылася прэзэнтацыя кнігі Зянона Пазьняка „Нацыянальныя каштоўнасьці”, прысьвечаная ролі і значэньню нацыянальнай культуры.

Перад прысутнымі выступіў аўтар. Ён адзначыў, што беларусам вельмі важна зрабіць тое, што не было зроблена на працягу ХХ-га стагоддзя – **стварыць тэорыю нацыянальнага Адраджэньня**. З гэтай мэтай у Беларусі Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя – БНФ арганізавала спэцыяльныя сэмінары – „Ідэалы БНР і беларускае Адраджэньне”, – якія праводзяцца кожны год. Даклады і рэфэраты на канфэрэнцыю рыхтуюцца па канцэптуальных пытаньнях разьвіцьця Беларусі і яе нацыянальнага жыцьця.

Кніга „Нацыянальныя каштоўнасьці” (як і некаторыя ранейшыя, прыкладам, „Развагі”) падпарадкавана гэтай мэце. „Мы павінны сістэмна думаць пра нашу культуру, дзяржаву, будучыню, народ. Тэорыя якраз дае такое сістэмнае думаньне”, – сказаў спадар Пазьняк. І галоўнае, што запатрабаванасьць такой працы у беларускім грамадзтве ёсьць, асабліва сярод моладзі.



*11. У грамадзкай залі сабора сьв. Кірылы Тураўскага ў Нью-Ёрку. За сталом Зянон Пазьняк. Выступае Сяргей Навумчык.*

„У кнізе адлюстраваныя, у асноўным, каштоўнасьці асноватворныя: гэта мова, чалавек, народ, тэрыторыя, культура народа, сьцяг, гэрб і г.д. Усё гэта разгледжана ў сутнасным значэньні (значыць, што такое ёсьць сама зьява, чаму яна гэтакая, а не іншая, чаму бяз яе нельга абыйсьціся). Першае, што ліквідаваў антыбеларускі рэжым на Беларусі – гэта наш гэрб і сьцяг. Трэба тлумачыць, чаму яны гэта рабілі і што гэта для нас значыць, чаму ў гісторыі за сьцяг людзі ішлі на сьмерць. Ў цяперашняй акупацыйнай школе і ўнівэрсітэце моладзі пра гэта ўжо ніхто ня скажа”, – падкрэсьліў аўтар.

Кніга адмыслова вышла невялічкім „кішэнным” фарматам, каб можна было лягчэй ёй карыстацца, чытаць і перадаваць у любых варунках, ведаючы сытуацыю, якая ёсьць на Беларусі.

Больш падрабязна Зянон Пазьняк спыніўся на важнейшым аспэкце тэмы – аспэкце культуры. Некалькі артыкулаў ён прысьвяціў мове, бо гэта, на думку аўтара, самае галоўнае, што робіць нас нацыяй, народам і дзяржавай, а для беларусаў – гэта каштоўнасьць нумар адзін. „Бяз мовы мы ня будзем мець ні дзяржавы, ні незалежнасьці, ні эканомікі, – падсумаваў сп. Пазьняк. – ...За апошнія часы сьвет вельмі перамяніўся. Працэс глябалізацыі – аб'ектыўны, ён ідзе незалежна ад нас, – працягваў аўтар. – Каб застацца самымі сабой, каб захаваць сваю ідэнтычнасьць, нацыянальную культуру, каб мацаваць сваю дзяржаву і стымуляваць яе разьвіцьцё, – патрэбна ўсьведамленьне нацыянальнай культуры. Культура зараз, фактычна, трымае ўсе народы. Культура, традыцыі цэментуюць і даюць магчымасьць нам ня зьнікнуць, не растварыцца ў сьвеце. На сёньняшні дзень культура робіцца адной з галоўных прыкметаў суверэнітэту. (Раней гэта былі межы. Яны вызначалі ўсё. Цяпер межы свабодныя, чалавек можа езьдзіць па ўсім сьвеце. Культура актыўна вызначае суверэнітэт грамадзтва і асобы.)

Культура яднае кожны народ. Сучасны рэжым на Беларусі хоць і не такі жорсткі, як, скажам, сталінскі, але ён антынацыянальны, антыбеларускі, ён зьнішчае нашу культуру, і абніжае яе ўзровень.

Гэты разбуральны, прымусовы рэгрэс культуры для нас вельмі небясьпечны, ён раскансалідоўвае нацыю. Людзі атрымоўваюць адукацыю (у чужой мове) – і не разумеюць каштоўнасьці нацыянальнай культуры. Яны проста выпадаюць з культуры нацыі, зь яе гістарычнага кантэксту.”

У працэсе гаворкі аўтарам былі закранутыя шматлікія пытаньні гнасеалогіі культуры: яе паходжаньне, шляхі разьвіцьця, які сэнс укладаецца ў шырокае паняцьце „культура” (усё, што створана чалавекам, яго рукамі і розумам) і ў вузейшы сэнс гэтага слова (як духоўная, творчая, мастацкая дзейнасьць чалавека), у чым адрозьненьне паміж культурнымі цывілізацыямі і варварамі.

У сваіх выступах (Вітаўт Кіпель, Антон Шукелойць, Сяргей Капытка, Ларыса Пузач, Тацьцяна Красоўская) падзякавалі аўтару за шчырую працу на карысьць Бацькаўшчыне, высока ацанілі новае выданьне і выказалі пажаданьне творчых посьпехаў аўтару ў далейшым.

Свой выступ **Вітаўт Кіпель** пачаў з успаміна пра брашуру В. Ластоўскага „Што трэба ведаць кожнаму беларусу”, якая яго ўразіла ў юнацтве.

---

* У час сьвяткаваньня Дня Незалежнасьці і 82-й гадавіны Сакавіка, праз два тыдні пасьля камічнай пагрозы Вінцука, адбылася вядомая спроба забойства Юры Беленькага. Тады рэжым арганізаваў вайсковае пабіцьцё людзей у цэнтры Менска. Схапілі і кінулі ў каталажкі больш пяцісот чалавек, зь іх трыста сяброў КХП – БНФ. На плошчы Якуба Коласа да Юрыя Беленькага падыйшла зграя ў камуфляжнай форме і ў чорных масках (пад выглядам „спэцназу,” а мо' і „спэцназ”). Яны накінуліся на яго і пачалі зьбіваць. Калі Юры ўжо страціў прытомнасьць, яны дабівалі яго, цаляючы ботамі па галаве. У апошні момант яго ўратавалі сябры партыі, адагнаўшы зграю. Юры патрапіў у шпіталь і больш года лячыўся ад наступстваў сьмяротнага пабіцьця. Усё менскае (вікаўскае) АБСЭ, што фальшыва гаварыла пра правы чалавека, цяпер ціхенька маўчала. Калі Гансу Віку журналісты радыё Свабода задалі пытаньне, чаму яго АБСЭ не рэагуе на спробу забойства кіраўніка апазыцыйнай партыі, Вік пачаў лепятаць па-руску нешта няўцямнае (беларушчыну ён падкрэслена „verachtet” – „презирал”), казаў пра тое, што, „эўрапейцы” „относятся ко всем совершенно одинаково” (?) (У мяне ўвогуле склалася ўражаньне, што Вік працаваў на некалькі разьведак адначасна.) Следзтва, вядома ж, нічога не магло даведацца, бо спэцназаўцы, маўляў, былі ў масках. – *(З. П.)*

„Калі Зянон Пазьняк даў мне гэтую кніжку („Нацыянальныя каштоўнасьці"), я зразумеў, што мы як нацыя сягнулі значна далей, чым тады, калі пісалася кніга Ластоўскага... Хацелася, каб кожны прачытаў гэтую кніжку. Бо сапраўды, як у кнізе адзначана, у гэтым падручніку, у гэтай лекцыі, мова – гэта асноўнае, што нас трымае разам", – падкрэсьліў выступоўца.

Спадар Кіпель прывёў просты прыклад з уласнага жыцьця, як трэба даражыць і шанаваць сваю мову. Зараз ён мае 82 гады, а на Беларусі жыў усяго 7 гадоў. І праз усё жыцьцё не згубіў сваёй роднай мовы.

Спадар Кіпель падкрэсьліў таксама станоўчыя разважаньні Зянона Пазьняка ў кнізе пра небясьпеку падмены культуры на эрзац-культуру: „Паход на нас ніколі не спыняўся, ён ня спынецца, пакуль Расея не дасягне свайго. Але, з другога боку, мы мацнеем, дзякуючы таму, што выходзяць такія кнігі, як кніга З. Пазьняка „Нацыянальныя каштоўнасьці".

**Ларыса Пузач** адзначыла: **„**Важна даць даніну ўдзячнасьці спадару Пазьняку за яго змаганьне за Беларусь. Сваімі кнігамі, сваім творчым словам Зянон Пазьняк фармуе наш беларускі дух. Кніга „Нацыянальныя каштоўнасьці" мае вялікую вагу, у ёй аўтар напамінае нам, што трэба верыць у Хрыста і Беларускую ідэю".

„У гэтым годзе, – сказаў **Антон Шукелойць**, – якраз выпадае шмат грамадзкіх юбілеяў і юбілеяў выдатных людзей. У шэрагу гэтых юбілеяў і наш паважаны Зянон Пазьняк.

Спадар Зянон мае вялікія абдоранасьці, зацікаўленьні ў розных дзялянках грамадзкага, палітычнага, мастацкага жыцьця. І ў кожнай з гэтых дзялянак ён актыўны і заўсёды – з вялікай карысьцю для беларускага народа. Па сваёй асьветніцкай справе З. Пазьняк – доктар мастацтвазнаўства. І выглядала б, што ў гэтай галіне ён і мусіў бы працаваць. І здольнасьці ў яго ў гэтым кірунку вялікія. Але ён працаваў у розных іншых сфэрах жыцьця, напрыклад, гісторыі, археалёгіі...

Кніжачка „Нацыянальныя каштоўнасьці" – другая такога кшталту пасьля невялічкай брашуры Ластоўскага, у якой усё аб Беларусі, якую можна пакласьці ў кішэнь, потым пераглядаць і чытаць усюды. Артыкулы, якія тут сабраныя, цікава прачытаць не адзін раз.

Сп. Пазьняк – чалавек шырокага зацікаўленьня. І ў кожнай з гэтых яго зацікаўленьняў ён стараецца нешта пакінуць, што б рэпрэзэнтавала беларускую справу. Кажная ягоная дзялянка зацікаўленьня вызначаецца кніжкай, якую ён выдае для нас усіх, для цэлага беларускага грамадзтва.

Жадаю доўгіх год, выдатнай працы на дабро беларускага народа з такім запалам і шырынёй поглядаў, як працаваў да гэтага часу."

Такім чынам прэзэнтацыя новай кнігі перайшла ў віншаваньне з нагоды 65-годдзя Зянона Пазьняка. Пранікнёна чытала вершы Зянона **Тацьцяна Красоўская**, прысутныя цёплымі словамі і пажаданьнямі віншавалі спадара Пазьняка, сьпявалі „Шмат год", гучала (у запісе) песьня-раманс Ігара Лучанка „Авэ-Марыя" на верш Зянона „Гучаньне анёльскага голасу".

Асабліва крануў выступ 6-гадовай **Паўлінкі Падлескай** (унучкі вядомага, сьветлай памяці, ветэрана БНФ Генадзя Банкевіча), якая прачытала вершы беларускіх паэтаў і прасьпявала беларускія песьні.

Відаць было (адчувалася), што ўсім прасутным добра знаходзіцца разам, слухаць беларускія сьпевы і нацыянальную музыку. Прыязныя гаворкі, пачастункі, цёплыя словы яшчэ доўга не адпускалі, не давалі сябрам разыходзіцца. Разам – было хораша і ўтульна.

На заканчэньне, што адпавядала агульнаму настрою, быў прачытаны верш Зянона: **„Свае"**

У цёмную ноч
Перад Днём Задушным,
Калі ўжо маўчалі дрэвы і травы,
Трывожна было на душы.
Хтось пастукаў у шыбы:
– Хто там?
– Свае.
Як добра!

***Марыля ЯКУШЭВІЧ***

*30 чэрвеня 200 9 г.*

# ПРА ВЫБАРЫ І БАЙКОТ

*(ліст да сябраў Фронту)*

Паважаныя сябры, фронтаўцы. На апошніх паседжаньнях Сойму мы абмяркоўвалі пытаньне аб будучых выбарах прэзыдэнта Беларусі, якія павінны адбыцца ў 2011 годзе. Высновa да якой мы прышлі наступная.




(Фота: А. Маголка)

*12. Зянон Пазьняк на беларускім мітынгу ў Празе 7 траўня 2009 г. Зьлева Ўладзіслаў Яньдзюк (адзін з арганізатараў мітынга і альтэрнатыўных пражскіх спатканьняў).*

***У выбарах, дзе пры падтрымцы рэжыму будзе незаконна балатавацца кандыдат Лукашэнка, удзельнічаць нельга. Гэта будуць ня выбары, а крымінальнае дзеяньне па чарговым захопу ўлады. Людзі ня маюць ніякага ўплыву на вынікі галасаваньня. Немагчыма рэальна пракантраляваць падлік галасоў, дзейнічае адладжаная сістэма фальсіфікацыі галасаваньня цалкам падпарадкаваная адміністрацыі рэжыму. Чалавек бяспраўны перад уладай.***

Захоп улады праз імітацыю выбараў характэрны для дыктатрскіх рэжымаў і забясьпечаны ўдзелам выбаршчыкаў у галасаваньні. Пры камуністычнай уладзе за савецкім часам стварэньне масавага ўдзелу ў галасаваньні было ўзьведзена ў ранг дзяржаўнай палітыкі. Негаласаваньне разглядалася як варожасьць да савецкага рэжыму (з усімі адсюль высновамі). Масавасьць галасаваньня давала магчымасьць лёгка паведамляць пра 99,99 адсоткаў прагаласаваных за кандыдатаў КПСС.

Перакуліць тую сістэму абдурваньня і прымусу мог толькі няўдзел у галасаваньні, пустыя выбарчыя ўчасткі. Але савецкае грамадзтва, запалоханае рэпрэсіямі, фактычна, знаходзілася ў палоне бальшавіцкай сілы, у лагеры, дзе рэальна ня мела ніякіх правоў, дзе не існавала магчымасьцяў для самаарганізацыі, і насельніцтва было няздольнае нават да такога пасіўнага супраціўленьня як няўдзел у галасаваньні. Бо кожны баяўся, што ягоны няўдзел выкліча рэпрэсіі.

Мы бачым як цяперашні антыбеларускі рэжым імкнецца вярнуць той савецкі страх у грамадзтва.

***Байкот фальшывых выбараў – гэта сродак адкрытай выбарчай барацьбы з рэжымам. Удзел у падманных выбарах ёсьць садзеяньне рэжыму, стварэньне яму ўмоваў для фальсіфікацыі і аб'яўленьня фальшывых вынікаў галасаваньня. Удзел ў такіх выбарах разам з узурпатарам, які ня мае права балатавацца, будзе абазначаць легітымізацыю ўмоваў, прызнаньне яго незаконных дзеяньняў „ дэ факта", дзеяньняў, у якіх пры любых выніках галасы будуць палічаны толькі на карысьць узурпатара.***

Зразумела, што і пасьля байкоту выбараў рэжым падасьць фальшывыя зьвесткі і паведаміць пра „перамогу" свайго кандыдата. Але ён тут ужо не схаваецца за плечы выбаршчыкаў і за тайнае галасаваньне, рэальнасьць стане кожнаму відаць і будзе наглядна пацьверджана. Ашуканства зробіцца відочным і навочна даказуемым. Усё гэта створыць новую сытуацыю ў грамадзтве і новыя дачыненьні, якія будуць спрыяць ліквідацыі антыбеларускага рэжыму.

Трэба разумець, што байкот не абавязкова выкліча імгненныя і кардынальныя перамены, але дакладна, што ён стане крокам да гэтых падзяў. Гэты крок трэба рабіць.

Цяпер пра тактыку нашай народнай партыі Фронту. Тактычна мы павінны зараз выступіць з патрабаваньнем зьмены існуючага выбарчага

заканадаўства. Павінна быць скасавана папярэдняе галасаваньне, гарантаваны удзел апазыцыйных рэжыму палітычных партыяў і арганізацыяў ва ўсіх выбарчых камісіях, гарантаваная свабода перадвыбарчай агітацыі на ўсіх узроўнях (сходы, мітынгі, пікеты, распаўсюд друкаванай прадукцыі, выступы ў агульнакраёвым і мясцововым радыё, тэлебачаньні, друку), гарантавана прысутнасьць назіральнікаў за галасаваньнем на выбарчых участках і за падлікам галасоў з правам патрабаваць відочнага ўсім падліку галасоў і пераліку галасоў пры сумніўных сытуацыях.

Як і ў 2005 годзе нам неабходна зьвярнуцца да Лукашэнкі з патрабаваньнем выконваць закон і ня ўдзельнічаць у выбарчай кампаніі 2011 года ў якасьці кандыдата.

Тэарэтычна мы павінны прадугледзець (мець на ўвазе) свайго кандыдыта (кандыдатуры ёсьць) на выпадак непрадбачаных падзеяў і агітаваць за байкот у выпадку непрыняцьця нашых законных патрабаваньняў. Такая схема нашых дзеяньняў на бліжэйшы час. Распаўсюджаньне інфармацыі пра сутнасьць і неабходнасьць байкоту трэба пачынаць цяпер.



*13. „Жыве Беларусь!" Нью-Ёрк, ля будынку ААН.*

(Фота А. Вінакурава)

У нашай передвыбарчай народнай палітыцы галоўная арыентацыя на людзей, якія валодаюць выбарчым правам, працоўным сацыяльным статусам і становішчам у грамадзтве, бо менавіта гэтая сьпелая, працоўная і актыўная частка народу вызначае грамадзкі настрой. На іх некалі ў 90-х абапіраўся Народны Фронт.

У час байкоту мы можам (пры неабходнасьці) каардынаваць дзеяньні зь іншымі арганізацыямі і асобамі, якія падтрымліваюць нашыя ўмовы і патрабаваньні.

Некаторыя арганізацыі і асобы, аднак, ужо пасьпяшаліся аб'явіць пра вылучэньне сваіх кандыдатаў на выбары і пра спадзяваньні на падтрымку з майго боку. Такія дзеяньні супярэчаць пазыцыі нашай народнай партыі і падтрымлівацца ня будуць.

Рыхтуймася да байкоту. Не павінна цемра і ашуканства існаваць бясконца. Ня могуць людзі вечна баяцца. Бярэмся за працу і будзе вынік.

Жыве Беларусь!

***Зянон Пазьняк***

*23 верасьня 2009 г.*

# ДОЎГАЕ ІСНАВАНЬНЕ АРДЫ

17 траўня 2009 г. Славацкая газэта „Novy Cas" апублікавала вялікі артыкул, прысьвечаны князю Дзьмітрыю Данскому. Аўтар не забыўся паведаміць пра юрыдычную крыніцу ўлады маскоўскіх князёў. А менавіта пра ярлык ад ардынскага хана, атрыманы на пачатку 14-га стагоддзя дзедам Дзьмітрыя Данскога. Успомніў нават пра літоўскага князя Альгерда, які ваяваў Маскву. Пра тое, як „сьвяты князь" Дзьмітры уцёк з Масквы і пакінуў горад на зьнішчэньне татарамі ў 1382 г.

Наш камэнтар: Для нас вельмі важна памятаць таксама тое, што адбывалася на працягу стагоддзяў пасьля згаданага мангольскага ярлыка. Нават класічныя расейскія гісторыкі прызнаюць, што Масковія працягнула дэспатычную імпэрскую палітыку Арды. Трэба зірнуць на карту Эўразіі, каб зразумець, у якім накірунку яна зьдзяйсьняла гэтую палітыку. Драпежная Масковія зрабіла каласальных рывок на Усход, дасягнула кітайскіх мораў і захапіла нават амэрыканскую Аляску. На працягу амаль 500 гадоў Масква рвалася з сваім ярлыком і на Захад, пагражаючы зьнішчэньнем усёй эўрапейскай цывілізацыі. Менавіта беларускі народ і беларуская армія стрымалі гэты дзікі патоп. Пра гэта ўсе неяк забыліся пад заклінаньне зьнешне саліднай, але цалкам міталагічнай расейскай гістарычнай навукі. А памятаць трэба. І памятаць перш за ўсё самым беларусам, якім тая ж Масква навязьліва лепіць жупел „рахманых ды слабенькіх".

***Валеры Буйвал***

# МАСКОЎСКІ ЦЫРК

Камуністы Расеі накіравалі „Пасхальное поздравление" Рускай праваслаўнай царкве. Загаловак гэтага пасланьня такі:

„И да воспрянет Русь! Пасхальное поздравление Председателя ЦК КПРФ, руководителя фракции Компартии в Государственной Думе Г.А.Зюганова 2009-04-19 06:40 / Пресс-служба ЦК КПРФ"

Пасланьне пачынаецца гэтак:

„Для всех нас, русских людей, поколения которых прожили жизнь под великой сенью православной цивилизации, светлый день Пасхи Христовой был, есть и на века останется праздником надежды и радости, торжества веры в то, что правда, добро и справедливость с неизбежностью восторжествуют...."

Сярэдзіна пасланьня надзвычай цікавая, але ня будзем далей цытаваць і стамляць чытача чарговай камуністычнай паранойяй. Заканчваецца зварот да „опіуму для народа" наступнай сэнтэнцыяй:

„...Справедливость и равенство, правда и человечность – вот те великие ценности и цели, что исконно лежат в основе и веры Христовой, и коммунистического идеала. Во имя них и должны мы объединить все наши силы в борьбе с несправедливостью, злом и тьмою, застилающими мир. И да возродится и воспрянет Русь!

С праздником, дорогие друзья!"

Як кажуць, не камэнтуем. Але комікі, я вам скажу! Але цыркачы! Скамарохі, майстэрзінгеры! Умом Расею не понять. Хоць ба ўжо закусвалі як сьлед.

***Адам Мікша***

## З Ь М Е С Т


1. З. Пазьняк. Дзень Незалежнасьці . . . . . 1
2. С. Навумчык. Дзень Незалежнасьці. Перамога тых, хто быў з ідэяй . . . . . 3
3. С. Навумчык. Мара пакаленьняў і вынік змаганьня . . . . . 6
4. М. К-скі. Незалежная дзяржава – найвялікшая каштоўнасьць нацыі . . . . . 7
5. З. Пазьняк. Палітычны Чарнобыль . . . . . 8
6. З. Пазьняк. Перамены трэба рыхтаваць . . . . . 9
7. Зварот да Эўразьвязу і эўрапейскіх палітыкаў . . . . . 10
8. Аб Усходнім Партнёрстве . . . . . 11
9. З. Пазьняк. Партнёрства і інтарэсы . . . . . 12
10. С. Навумчык. Парушэньні ў часе рэфэрэндуму – 1995 . . . . . 13
11. Ігуменьскі шлях . . . . . 14
12. С. Навумчык. Барацьба за незалежнасьць . . . . . 14
13. Ю. Беленькі. Ганс Вік – падвойнае дно . . . . . 17
14. Марыля Якушэвіч. Прээнтацыя новай кнігі . . . . . 18
15. З. Пазьняк. Пра выбары і байкот . . . . . 19
16. В. Буйвал. Доўгае існаваньне Арды . . . . . 20
17. Адам Мікша. Маскоўскі цырк . . . . . 20



*Нумар аддрукаваны пры падтрымцы беларускай фундацыі імя Рамуальда Траўгута.*

Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы

**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**

**Адрас рэдакцыі: 02–017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**

**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**